Пралетэры ўсіх краёў, злучайцеся!

# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 127 (4031)
ЧАЦЬВЕР, 14 МАЯ
1931 г.
Гэты нумар 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫНКА

# Работу спажывецкай каапэрацыі—на вышэйшую ступень

Сьнежаньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) у сваёй рэзалюцыі па справаздачным дакладзе Цэнтрасаюзу аз ўсю шырыню паставіў пытаньне аб рашучым паляпшэньні работы спажывецкай каапэрацыі ў бок «блізумоўнага забесьпячэньня ў першую чаргу важнейшых вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва і ўвязкі справы забесьпячэньня з выкананьнем вытворчых плянаў».

Выкананьне гэтых задач патрабавала ад спажывецкай каапэрацыі карэннага паляпшэньня і перабудовы яе арганізацыйнай структуры, не гандлёвай і вытворчай дзейнасьці на новых пачатках.

Аднак, сур'ёзьнейшыя недахопы ў рабоце ўсёй сыстэмы спажывецкай каапэрацыі, якія былі адзначаны і ў рэзалюцыі сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), у большай сваёй ступені ня зжыты яшчэ і на сёньшні дзень.

Асноўным недахопам зьяўляецца тое, што СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЭРАЦЫЯ ЯШЧЭ НЕ ПЕРАБУДАВАЛА СВАЁЙ РАБОТЫ НА АСНОВЕ ГАСПАДАРЧАГА РАЗРАХУНКУ, ПАГАРДЖАЕ ЗАДАЧАЙ РАЗЬВІЦЬЦЯ СВАЁЙ ГАНДЛЁВАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ І ПАЛЯПШЭНЬНЯ АБСЛУГОЎВАНЬНЯ РАБОЧАГА СПАЖЫЦА. Тут у значнай ступені адчуваецца недаацэнка задач усямернага разьвіцьця савецкага гандлю ў сувязі з выцясьненьнем з рынку прыватніка, «лева»-апартуністычная тэндэнцыя перасночыць да непасрэднага пераходу да простага прадуктаабмену.

Адказьнейшыя задачы трэцяга году пяцігодкі, завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі з усё ўзрастаючай вострасьцю ставяць пытаньне аб карэнным паляпшэньні работы ўсіх зьвеньняў каапэрацыі, аб поўнай выразнасьці і скіраванасьці асноўных кантынгентаў работнікаў, пікіруе наяўную цякучасьць рабочай сілы.

Вось чаму паданая намі сёньня адозва ЦК УсеКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу аб рабоце спажывецкай каапэрацыі набывае значэньне выключнай гаспадарча-палітычнай важнасьці, як дакумант, які дакладна вызначае шляхі ўзмацненьня ўсёй каапэрацыйнай сыстэмы, як баявая праграма барацьбы за паляпшэньне арганізацыі справы забесьпячэньня працоўных мас.

Адозва практычна вырашае ўсе праблемы каапэрацыйнага будаўніцтва, забясьпечвае магчымасьці хуткага вырашэньня вузлавых пытаньняў, зьвязаных з паляпшэньнем усіх бакоў дзейнасьці спажывецкай каапэрацыі.

Адозва ўносіць карэнныя зьмены ў АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ФОРМЫ КААПЭРАЦЫІ. Пры Цэнтрасаюзе, рэспубліканскіх, абласных і краявых органах каапэрацыі стваравоцца ГАЛІНАВЫЯ АБ'ЯДНАНЬНІ, якія дзейнічаюць на аснове гаспадарчага разрахунку, на чале з дырэкцыямі. Цэнтрасаюз перабудоўваецца паводле тыпу ВСНГ і яго прэзыдыуму. Арганізацыя аб'яднаньняў забясьпечыць лепшае абслугоўваньне спажыўца, спрашчэньне кіраўніцтва, паскарэньне тавараабароту, канкрэтызацыю і спэцыялізацыю кіраўніцтва гандлёвай сеткі.

Буйнейшым недахопам у рабоце каапэрацыйнай таваразраводзячай сеткі зьяўляецца наяўнасьць фактаў ЗАТАВАРАНЬНЯ. У справе зьнішчэньня гэтых недахопаў, якія параджаюцца непаваротлівасьцю і бюракратызмам у рабоце органаў каапэрацыі, павінны адыграць рашаючую ролю СПЭЦЫЯЛІЗАЦЫЯ І НАБЛІЖЭНЬНЕ КІРАЎНІЦТВА ДА НІЗАВЫХ ЗЬВЕНЬНЯЎ (галінавыя аб'яднаньні), а таксама СКАСАВАНЬНЕ ПРАКТЫКІ НАРМАВАНЬНЯ І БРАНІЯВАНЬНЯ ПРАМТАВАРАЎ (за выключэньнем асобных відаў апошніх) і значнае ПАШЫРЭНЬНЕ ТАВАРАПРАВОДЗЯЧАЙ СЕТКІ, прадугледжаных адозвай.

ВЫТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЬЦЬ спажывецкай каапэрацыі, паводле адозвы, таксама перабудоўваецца на новых прынцыпах. Нанова стваравоцца вытворчыя аб'яднаньні, прычым у галіне хлебапячэньня буйныя мэханізаваныя заводы і пякарні арганізуюцца ў спэцыяльныя трэсты пры рэспубліканскіх, абласных і краявых саюзах каапэрацыі; буйныя гародныя, сьвінагадоўчыя, малочныя і птушніцкія гаспадаркі абласнога, агульнагарадзкога ці міжраённага значэньня арганізуюцца ў самастойныя гаспадарчыя аб'яднаньні.

Адозва забясьпечвае за спажкаапэрацыяй поўную магчымасьць СКАНЦЭНТРАВАЦЬ УСЮ СВАЮ ЎВАГУ НА КАРДЫНАЛЬНЫХ ПЫТАНЬНЯХ ВЫТВОРЧАЙ РАБОТЫ, разгрузіўшы каапэрацыю ад функцый, якія не ўваходзяць у копа яе непасрэдных задач. Так, прамысловасьць (за выключэньнем прадпрыемстваў дробнага поўсаматужнага тыпу) перадаецца Наркамснабу, цырульні і пашыўныя майстэрні — сампрамкаапэрацыі, пральні — гарсаветам.

У мэтах удасканаленьня і паляпшэньня ЗАГАТОЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ СПАЖКААПЭРАЦЫІ на Наркамснаб і Цэнтрасаюз ускладзен абавязак дакладна вызначыць віды загатовак, паводле якіх спажывецкая каапэрацыя выступае ці іншай тэрыторыі.

Для паляпшэньня і пашырэньня ўстаноў ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ апошняе выдзяляецца ў самастойную сэкцыю ў сыстэме спажывецкай каапэрацыі з асобным паявым капіталам, прычым сюды-ж дапускаецца аб'яднаньне «Усенархарч».

Адсэвай вызначаны мерапрыемствы па ўрэгуляваньні ЗАРПЛАТЫ работнікам каапэрацыі, па пастаноўцы тарыфнай палітыкі на службу ўзмацненьня каапэрацыйных арганізацый. Гэтыя мерапрыемствы ідуць па лініі ПАВЫШЭНЬНЯ ЗАРПЛАТЫ, УВЯДЗЕНЬНЯ СЫСТЭМЫ ЗААХВОЧАНЬНЯ АПЛАТЫ ПРАЦЫ ШЛЯХАМ УСТАНАЎЛЕНЬНЯ ЗАРПЛАТЫ Ў ПРОЦАНТАХ АД ЗВАРОТУ, АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЯ ПРЫНЦЫПУ ПРЭМІЯВАНЬНЯ ЗА ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ЯКАСНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ РАБОТЫ. Усе гэтыя мерапрыемствы, якія вынікаюць з асноўнай устаноўкі партыі і ўраду на павышэньне жыцьцёвага ўзроўню працоўных мас і забесьпячэньне ў першую чаргу рашаючых вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва, — забясьпечыць у спажывецкай каапэрацыі павышэньне прадукцыйнасьці работы, кансалідацыю асноўных кантынгентаў работнікаў, ліквідуе наяўную цякучасьць рабочай сілы.

ПРАБЛЕМА КАДРАЎ стаіць для спажывецкай каапэрацыі вельмі востра. Барацьба з засьмечанасьцю апарату каапэрацыі чужымі, шкоднымі, меншавіцка-эсэраўскімі элемэнтамі, аб чым выразна сказаў у сваіх пастановах сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), настойліва высоўвае задачу падрыхтоўкі новых тысяч каапэрацыйных работнікаў. Адозва ставіць гэта пытаньне на рэйкі практычнага вырашэньня, абавязвае Цэнтрасаюз у якасьці першага канкрэтнага мерапрыемства разгарнуць СЕТКУ КУРСАЎ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПЕРАПАДРЫХТОЎЦЫ 150.000 РАБОТНІКАЎ розных спэцыяльнасьцяй.

ПАЛЯПШЭНЬНЕ ПАРТЫЙНАЙ І ПРАФСАЮЗНАЙ РАБОТЫ, НАБЛІЖЭНЬНЕ ПАРТЫЙНЫХ, КАМСАМОЛЬСКІХ ЯЧЭЕК І ПРАФОРГАНАЎ ДА ВЫТВОРЧЫХ ЗАДАЧ КААПЭРАЦЫІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ВАЖНЕЙШАЙ ПРАДПАСЫЛКАЙ ДА ЎЗЬНЯЦЬЦЯ ЯКАСЬЦІ ЎСЁЙ РАБОТЫ КААПЭРАЦЫЙНАЙ СЫСТЭМЫ. Выходзячы з гэтага, адозва вызначае стварэньне пры кожным ЗРК цэх'ячэйкі з партгрупамі ў асобных гаспадарчых адзінках. Пры ўсіх буйных і сярэдніх магазынах таксама арганізуюцца самастойныя партыйныя і камсамольскія ячэйкі. Пры ЗРК стваравоцца мясцкомы з прафгрупамі.

Адозва ў канцэнтраваным выглядзе ставіць УСЮ СУМУ БАЯВЫХ ЗАДАЧ спажывецкай каапэрацыі. Адозва адкрывае новую старонку ў гісторыі каапэрацыйнага будаўніцтва. Яна зьяўляецца разгорнутай праграмай барацьбы за ўзьняцьце сыстэмы спажывецкай каапэрацыі і ўсёй справы арганізацыі забесьпячэньня на новую вышэйшую ступень, за выкарчоўваньне рэштак таго шкодніцтва ў забесьпячэньні і каапэрацыі з боку агэнтуры міжнароднага меншавізму, разгорнутую карціну якога выкрыў працэс саюзнага ЦК РСДРП(м).

Уся партыя, уся рабочая кляса і яе арганізацыі павінны, закасаўшы рукавы, узяцца за правядзеньне адозвы ў жыцьцё. Адозва павінна стаць зброяй мабілізацыі найшырэйшых мас працоўных на пасьпяховае вырашэньне праблемы забесьпячэньня — гэтага важнейшага вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

КААПЭРАЦЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ БССР ПАВІННЫ НЕАДКЛАДНА ПЕРАБУДАВАЦЬ УСЮ СВАЮ РАБОТУ НА АСНОВЕ АДОЗВЫ, ПЕРАКЛЮЧЫЎШЫ ЎВЕСЬ СВОЙ АПАРАТ НА РЭАЛІЗАЦЫЮ ЗАДАЧ УКАРАНЕНЬНЯ ГАСПАДАРЧАГА РАЗРАХУНКУ ВА ЎСЕ ЗЬВЕНЬНІ КААПЭРАЦЫЙНАЙ СЫСТЭМЫ, НА ПАЛЯПШЭНЬНЕ І ПАШЫРЭНЬНЕ СВАЁЙ ГАНДЛЁВАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ, НА ПОЎНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ РАШАЮЧЫХ ВУЧАСТКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

Зьмятаючы са свайго шляху апартуністычныя элемэнты, выганяючы з каапэрацыйных арганізацый усё чужое, клясава-варожае, рабочая кляса, пад кіраўніцтвам партыі ўпэўнена пойдзе на перамаганьне труднасьцяй, што стаяць перад намі, забясьпечыць рашучыя посьпехі ў справе паляпшэньня работы спажывецкай каапэрацыі.

# Усесаюзны дзень трактара

З 10 па 20 мая па ўсім Савецкім Саюзе Трактарацэнтрам і саюзам рабочых МТС і батракоў праводзіцца «Дзень трактара», як масавая гаспадарча палітычная кампанія.

У гэтыя дні неабходна мабілізаваць актыўнасьць шырокіх мас на барацьбу за ўшчыльненьне тэрміну сяўбы, укараненьне выдзельшчыны, ліквідацыю абязьлічкі, супроць перавыдаткаў гаручага, супроць прастою і паломак трактараў машын і сельскагаспадарчых прылад, за выкананьне і перавыкананьне норм, якасьць і своечасовасьць рамонту трактароў і прылад, за аўдаланьне тэхнікай лепшую падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

У «Дзень трактара» неабходна выявіць лепшыя ўдарныя брыгады і асобных ударнікаў-трактарыстаў, якія маюць лепшыя паказальнікі ў выкарыстаньні трактара і ўважлівым да яго адноўнае і прэміяваць іх.

Правядзеньне «Дня трактара» патрабуе з боку раённых партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый, асабліва рабочых МТС і батракоў, разгортваньня масавай палітычнай работы, а раённыя газэты павінны адлюстроўваць на сваіх старонках ход падрыхтоўкі і самае праведзеньне «Дня трактара».

Для правядзеньня «Дня трактара» павінны быць прыцягнуты ўсе культурныя ўстановы раёну.

## *Выстаўка рабочага вынаходніцтва*

МАСКВА. Паводле пастановы УсеЦСПС у бліжэйшы час у Маскве адкрываецца стала дзейнічаючая ўсесаюзная выстаўка рабочага вынаходніцтва і рацыяналізацыі.

На выстаўцы будуць прадэманстраваны лепшыя навінкі і дасягненьні ў галіне рабочага вынаходніцтва, рацыяналізацыі, навукова-дасьледчай работы і матар'ялы росту вынаходніцтва.

На выстаўцы арганізуюцца кансультацыі па тэхнічных, прававых і арганізацыйных пытаньнях.

Выстаўка зьявіцца актыўным арганізатарам, цесна зьвязваючым рабочага-вынаходцу з ажыцьцяўленьнем лёзунгу тав. Сталіна: «вывучыць тэхніку, авладаць тэхнікай!»

Для скарэйшай арганізацыі выстаўкі арганізаваны спэцыяльны камітэт.

Грамадзкія арганізацыі фабрык і заводаў не павінны заставацца ў баку ад арганізацыі выстаўкі. Да гэтай справы павінны быць прыцягнуты добраахвотніцкія групы «БРИЗ'а і «ИТР».

# Прыезд пралетарскіх пісьменьнікаў СССР

Учора ў Менск, для сустрэчы Максіма Горкага прыбыла з Масквы дэлегацыя пралетарскіх пісьменьнікаў СССР. У складзе дэлегацыі т. т. Серафімовіч, Гладкоў, Карэнеў, Матэ Залка, Каваленка, Ус. Іваноў, Салоў (ударнік у літаратуры, рабочы заводу «АМО») і г. д.

Дэлегацыя прысутнічала на пленуме БелАПП'у, наведала Універсітэцкі гарадок. Увечары дэлегацыя выехала ў Негарэлае.

# Бурныя дэманстрацыі па ўсёй Гішпаніі

## Сяляне захопліваюць памешчыцкія маёнткі

## У МАДРЫДЗЕ—СТАН АБЛОГІ

ПАРЫЖ, 12. Паводле вестак агэнцтва Гавас, у Мадрыдзе 10 мая вечарам адбылася ДЗЕСЯЦІТЫСЯЧНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ, арганізаваная гішпанскай кампартыяй. Дэманстранты праходзілі праз цэнтральныя раёны гораду з чырвонымі сьцягамі і воклікамі «Прэч духавенства», «Патрабуем разбраеньня грамадзянскай гвардыі».

Пры спробе дэманстрантаў уварвацца ў казарму грамадзянскай гвардыі паміж імі і паліцыяй пачалася перастрэлка, у выніку якой шмат параненых, з іх два цяжка. ГРУПА КАМСАМОЛЬЦАЎ прабавала захапіць склад зброі грамадзянскай гвардыі, але была разагнана паліцыяй і войскам. Другой групе камсамольцаў удалося зламаць склад зброі і захапіць там паляўнічую зброю. Быў таксама зроблен замах на захоп другога складу зброі. ПАМІЖ КАМСАМОЛЬЦАМІ І ГРАМАДЗЯНСКАЙ ГВАРДЫЯЙ АДБЫВАЛАСЯ ПЕРАСТРЭЛКА.

Дэманстрацыя адбывалася ўсю ноч.

Адначасова па закліку рэвалюцыйнай прафарганізацыі забаставалі ўсе шафэры, таксі і пераважаючая большасьць трамвайных служачых і рабочых, шматлікія будаўнічыя рабочыя. У горадзе ходзяць усяго толькі некалькі трамваяў. Вулічныя дэманстрацыі ня спыняюцца.

11-га мая ў 12 гадзін ночы дэманстрантам удалося падпаліць рэзэдэнцыю ордэна іезуітаў.

У Севільлі дэманстрантамі было спалена два манастыры і йезуіцкі кастёл. Апрача таго, 6 МАНАСТЫРОЎ, ДЗЬВЕ ДРУКАРНІ РЭАКЦЫЙНЫХ ГАЗЭТ БЫЛІ РАЗГРОМЛЕНЫ ДЭМАНСТРАНТАМІ. Войска адкрыла па дэманстрантах страляніну. У горадзе сярод буржуазнага насельніцтва вялікая паніка. У МАЛАЗЕ дэманстранты ноччу спалілі два манастыры і палац біскупа.

Як паведамляе мадрыдзкі карэспандэнт «Нэйе Фрэйе Прэса», ГІШПАНСКІЯ СЯЛЯНЕ ЗАХАПІЛІ РАД ПАМЕШЧЫЦКІХ МАЁНТКАЎ.

Агэнцтва Гавас падае, што у Мадрыдзе абвешчан стан аблогі. Аднак, ня гледзячы на гэта, дэманстрацыі ня спыняюцца. Усе біржавыя апэрацыі па ўсёй Гішпаніі спынены. Рада міністраў бязупынна засядае. У Мадрыдзе пануе надзвычайнае ўзбуджэньне. У спэцыяльным паведамленьні ўрад зноў пацьвярджае, што ў МАДРЫДЗЕ АБВЕШЧАН СТАН АБЛОГІ.

# РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ ПА УСЁЙ КРАІНЕ

## Прэстыж часовага ўраду рэзка ўпаў

ЛЁНДАН, 12. Прэстыж часовага гішпанскага ўраду, мяркуючы па вестках, якія паступаюць з Гішпаніі, рэзка падае. Становіцца ўсё больш і больш ясным, што ўрад Заморы дасьць рабочым ня больш, чым дыктатура манархічных генэралаў.

Гост колькасьці забастовак ва ўсіх канцох Гішпаніі сьведчыць, што сярод рабочых расьце палітычная сьвядомасьць, што рабочыя ня толькі дабіваюцца палепшаньня умоў працы, але змагаюцца за палітычныя патрабаваньні. Надзвычай характэрны факт росту рэвалюцыйных настрояў сярод маракоў гішпанскага флёту, які адказаў хваляваньнямі і паўстаньнямі на арышт некалькіх маракоў. У флёце падае дысцыпліна, многія маракі кідаюць флёт. Часовы ўрад разумее, што на флёт ён спадзявацца ня можа, усё больш і больш абапіраецца на грамадзянскую армію, якая надзвычай рэакцыйная, хаця і аказвае падтрыманьне рэспубліканскаму ўраду.

Манархісты і клерыкалы, карыстаючыся, мяркуецца, слабасьцю ўраду, вядуць сябе адкрыта і правакацыйна. Манархісты настоялі, каб урад вызваліў генэрала Берэнгера. Але «заискивая» перад манархістамі, Замора ня ўлічыў настрою мас, якія адказалі на гэты акт ураду выбухам абурэньня.

Былі спалены 6 каталіцкіх манастыроў. Шмат манастыроў разбурана. Замора абясьцыў Мадрыд на ваенным становішчы і зьвярнуўся да дапамогі грамадзянскай гвардыі для жорсткага задушэньня дэманстрацыі. Аднак жорсткасьць грамадзкай гвардыі толькі распаліла гнеў мас. Рэвалюцыйны рух пашоў на новым русьле: супроць часовага ўраду—былі высунуты патрабаваньні аб адстаўцы міністра ўнутраных спраў Мауры і аб роспуску грамадзянскай гвардыі.

Прэстыж ураду рэзка ўпаў. У той час, як урад сьцьвярджае, быццам ён у Мадрыдзе аднавіў парадак, паступаюць весткі аб сур'ёзных хваляваньнях у Кадыксе, Адыганто, Малазе, Кардове, Сэвільлі і Барсэлоне, прычым усюды мелі месца напады на цэрквы і на манархічныя і іншыя рэакцыйныя газэты.

У Барсэлоне становішча асабліва абвастрылася ў сувязі з прыходам у горад некалькіх тысяч галадаючых сялян з паблізкіх раёнаў. Баючыся выступленьняў, губэрнатар загадаў адправіць сялян па дамох.

# У „дэмакратычнай" Нямеччыне

## ПАКАРАНЬНЕ ШКОЛЬНІКАЎ ЗА ПАЕЗДКУ Ў СССР

БЭРЛІН. Тры баварскія школьнікі, якія паехалі мінулым летам у СССР, дзе яны праводзілі свой водпуск у дзіцячым доме адпачынку, падпалі, вярнуўшыся ў Баварыю, самым нязвычайным рэпрэсіям. Бацькі аднаго з іх былі аштрафаваны па 40 марак або 8 дзён турэмнага зьняволеньня, а школьнік быў пасаджан у карцар. Другога школьніка хацелі адправіць у дом прымусовага выхаваньня. Школьніца Кафка з Нюрэнбургу ў пакараньне за паездку ў СССР была пакінута ў сваёй клясе на другі год.

## ФАШЫСЦКІ ЎРАД КАСУЕ 8-ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ

ВІЛЬНЯ, 11. Як паведамляе віленскі фашысцкі друк, міністэрства працы, а таксама прамысловасьці і гандлю распачалі нараду па выпрацаваньні новага закону аб канчатковым скасаваньні 8-гадзіннага рабочага дня.

Трэба адзначыць, што і дагэтуль 8-гадзінны рабочы дзень існаваў у фашысцкай Польшчы толькі на паперы, на заводах і фабрыках ён быў значна большы, бо перавышаў 10-12 гадзін. Выдаючы гэты закон, фашысцкі ўрад дае поўную магчымасьць капіталістам і памешчыкам баскантрольна эксплёатаваць рабочую клясу.

# МАКСІМ ГОРКІ ПРЫЕХАЎ У СССР

## СУСТРЭЧА ПЕРШАГА ПРАЛЕТАРСКАГА ПІСЬМЕНЬНІКА СССР

Учора вячэрнім цягніком у Негарэлае прыехаў улюбёны працоўнымі СССР першы пралетарскі пісьменьнік Максім Горкі.

На рубяжы двух сьветаў Горкага сустракалі прадстаўнікі шматлікіх арганізацый, чырвонаармейцы пагранатраду і працоўныя Койданава і Негарэлага.

У сустрэчы прымала ўдзел дэлегацыя ад ФОСП'у ў складзе т. т. Гладкова, Серафімовіча, Матэ Залка і інш., а таксама дэлегацыя ад беларускіх пісьменьніцкіх аб'яднаньняў.

Прадстаўнікі менскіх заводаў імя Варашылава, «Камунар» і інш. перадалі «Буревестнику» рэвалюцыі гаачае прывітаньне.

Стоячы ля адчыненага вакна вагону, Горкі ў таварыскай гутарцы з дэлегацыямі рабочых, пісьменьнікаў, прадстаўнікамі цэнтральных газэт і чырвонаармейцамі расказваў пра жыцьцё замежных рабочых, пра адносіны капіталістаў да СССР, да пяцігодкі. Горкі з вялікай зацікаўленасьцю распытваў аб жыцьці Чырвонай арміі, аб барацьбе ўдарнікаў, аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Слухаючы простыя расказы ўдарнікаў, чырвонаармейцаў, захапляючыся нашымі перамогамі, ён гаварыў:

— Маладая краіна, малады народ поўны перакананьня, гэтакая «спліща»! Вы творыце сапраўды цуды!»

Тысячныя калёны менскіх пралетараў-ударнікаў сацыялістычнай будоўлі, са сьцягамі, плякатамі, аркестрамі прыйшлі на вакзал сустрэць свайго любага Максіма Горкага.

... Доўга цягнецца час. Цягнік спазьніўся на 30 хвілін: ён быў затрыман на ст. Негарэлае, дзе Горкага віталі працоўныя масы і прадстаўнікі партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый.

... Нарэшце паказаліся агні, загудзеў паравозны гудок.

ГОРКІ З НАМІ.

— Няхай жыве «Буревестник» рэвалюцыі!

— Няхай жыве наш Горкі!

... Горкі на можа выйсьці з вагону. Дактары, якія едуць з ім, катэгарычна забаранілі яму гэта. З вакна вагону Горкі гэстамі рукі горача адказвае на бурныя прывітаньні сустракаючых.

Ад імя пралетарыяту і працоўных БССР Горкага вітае тав. БУДЗІНСКІ.

— У асобе тав. Горкага мы вітаем першага пралетарскага пісьменьніка нашай краіны. Ён вырас з нашага асяродзьдзя, ён плоцьцю і крывёю—ад рабочай клясы. Усё свае жыцьцё Горкі аддаў справе рабочай клясы, справе пралетарскай рэвалюцыі.

Зараз, калі капіталістычныя краіны пры дапамозе сацыял-фашыстаў, рыхтуюць інтэрвэнцыю супроць СССР, Горкі штодзенна выкрывае замыслы імпэрыялістаў, заклікае працоўных усяго сьвету выступіць на абарону пралетарскай бацькаўшчыны.

Вось чаму кожны прыезд Горкага ў нашу краіну—сьвята для пралетарыяту і працоўных БССР і ўсяго Савецкага Саюзу...

Ад навуковых работнікаў БССР з прывітаньнем выступіў праф. ВАЛЬФСОН.

— Мы толькі што віталі Максіма Горкага на ст. Негарэлае. Некалькі слоў гуткарні з Горкім уліў у нас яшчэ больш энэргіі, яшчэ больш энтузіязму для вялікай сацыялістычнай будоўлі, якая разгарнулася ў нашай краіне...

Мы заклікаем усіх працоўных: жыць, як жыў Горкі, працаваць па-горкаўску, змагацца як ён за справу рабочай клясы.

Пад гукі аркестру і бурныя крыкі «ура» цягнік павольна адыйшоў ад станцыі.

# Аб спажывецкай каапэрацыі

## Усім партыйным, савецкім, гаспадарчым, каапэрацыйным, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям

Сур'ёзнейшая роля спажкаапэрацыі ў справе ажыцьцяўленьня народна-гаспадарчага пляну трэцяга году пяцігодкі, гігантскі рост таваразвароту краіны і зялёная ўдзельная вага каапэрацыйнай таваразраводзячай сеткі пры адсталасьці і бюракратычнасьці каапэрацыйных органаў патрабуюць перабудовы работы спажкаапэрацыі на новых пачатках.

Асноўным недахопам у цяперашняй рабоце спажкаапэрацыі зьяўляюцца непаваротлівасьць і бюракратызм у рабоце, якія вядуць да замарожваньня таваразвароту, з прычыны чаго нярэдка штучна стваравецца беставар'е пры значным павялічэньні таварных рэштак на складах.

Гэтыя недахопы ў рабоце спажкаапэрацыі тлумачацца галоўным чынам тым, што, выцясьнёнымі прыватніка і завазваўшы манапольнае становішча на рынку, спажкаапэрацыя стала пагарджаць прынцыпам гаспадарчага разрахунку і задачай разгортваньня савецкага гандлю, памылкова прадпалажыўшы, што ўжо насьпелі ўмовы для непасрэднага пераходу да простага прадуктаабмену. Пры гэтым спажкаапэрацыя забылася, што выцясьненьне прыватніка і прыватнага гандлю яшчэ не азначае зьнішчэньня ўсякага гандлю, што, наадварот, выцясьненьне прыватнага гандлю мяркуе ўсямернае разьвіцьцё савецкага гандлю і разгортваньне сеткі каапэрацыйных і дзяржаўных гандлёвых арганізацый па ўсім СССР.

На падставе гэтых памылак узьнікла аслабленьне прынцыпу выбарчасьці нізавых зьвеньняў спажкаапэрацыі і адрыў каапэрацыі ад сваёй масавай базы, што не магло ня прывесьці да ўзмацненьня бескантрольнасьці апарату, ігнараваньня запатрабаваньняў спажыўцоў і сыстэмы «абязьлічанага гандлю», г. з. завозу і продажу тавараў бяз уліку асаблівасьцяй раёнаў СССР і запатрабаваньняў іх насельніцтва.

У мэтах зьнішчэньня гэтых недахопаў і перабудовы работы спажкаапэрацыі на новых пачатках, Савет Народных Камісараў Саюзу ССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Цэнтрасаюз прапануюць правесьці ў жыцьцё наступныя мерапрыемствы:

### I. Раздробны і гуртавы гандаль спажкаапэрацыі

У мэтах лепшага абслугоўваньня спажыўца, спрашчэньня спажыўца, паскарэньня тавараразвароту і спэцыялізацыі кіраўніцтва гандлёвай сеткай стваравоцца прыцэнтрах гандлёвай сеткі стваравоцца ў Цэнтрасаюзе гуртавыя, галінавыя, усесаюзныя аб'яднаньні, якія дзейнічаюць на падставе гаспадарчага разрахунку па наступных групах тавараў: а) гатовая вопратка; б) галёшы, абутак і скурацыя тавары; в) галянтарэя, трыкатаж, гатовая бялізна; г) мануфактурна-суконна-ваўняныя вырабы; д) тавары па культурным абслугоўваньні; е) сілікатныя вырабы; ж) скабяныя вырабы; з) вырабы саматужнай прамысловасьці; і) бакалейна-гастранамічныя тавары; к) плодагародніна (з функцыямі загатоўча-забясьпечваючымі); л) малочныя прадукты (з функцыямі загатоўча-забясьпечваючымі); а Цэнтрасаюз перабудаваць па тыпе ВСНГ і яго прэзыдыуму.

У рэспубліках, краёх і абласьцях стварыць рэспубліканскія, краявыя і абласныя аб'яднаньні раздробнага гандлю па вышэйпералічаных групах тавараў з дапаўненьнем аб'яднаньняў па наступных групах тавараў: а) мэблевыя вырабы, б) мяса, птушка; в) цукерныя вырабы; г) дзіцячага забясьпячэньня.

УВАГА. У тых выпадках, калі ў пасобных гарадох па наяўнасьці гандлёвай сеткі ці нязначнасьці таваразвароту вылучэньне спэцыялізаванай таваразраводзячай сеткі па ўсіх пералічаных відах тавараў зьяўляецца нямэтазгодным, дапушчаць арганізацыю камбінаванай сеткі па продажы розных тавараў, па магчымасьці аднародных.

Для кіраваньня галінавымі аб'яднаньнямі стварыць дырэкцыі, якія назначаюцца і зацьвярджаюцца на гуртавых аб'яднаньнях—прэзыдыумам Цэнтрасаюзу, на раздробных — прэзыдыумамі рэспубліканскіх, краявых і абласных спажсаюзаў.

Рэспубліканскім, краявым і абласным галінавым аб'яднаньням перадаць усе спэцыялізаваныя магазыны спажывецкай каапэрацыі па паказаных групах тавараў з абавязацельствам арганізацыі пры кожным аб'яднаньні складачна-тарна-транспартнай гаспадаркі.

Прапанаваць Цэнтрасаюзу стварыць у рэспубліках, краёх і абласьцях гуртавыя склады, а ВСНГ — перадаць Цэнтрасаюзу рад базавых складаў, якія ня маюць непасрэднай сувязі з прадпрыемствамі. ВСНГ і Цэнтрасаюзу ў 2-хдзённы тэрмін паведаміць у СПА аб колькасьці складаў, якія перадаюцца, і аб умовах іх перадачы.

2. Скасаваць практыку нармаваньня продажу прамтавараў, устанавіўшы часова толькі для пасобных, найбольш дэфіцытных тавараў, норму воднуску ў адны рукі.

Скасаваць практыку браніраваньня прамтавараў (за выключэньнем браніраваньня прамтавараў па апэрацыях: лесасраспрацоўкі, лесасплаў, пушніна, загатоўкі — пушнины, яек і масла) і продажу іх па ардэрох, захаваўшы часова водпуск па ардэрох толькі для вопваткі (гарнітуры, польты) і абутку з устанаўленьнем тэрміну дзеяньня ардэроў (10 дзён).

3. Устанаўляючы, што галоўная маса тавараў збываецца праз каапэрацыйную раздробную сетку, вызначыць удзел дзяржаўнага раздробнага гандлю ў разьмеры ня больш 30 проц усіх фондаў гарадзкога гандлю, дапускаючы з дазволу СПА ў паасобных гарадох павышэньне ўдзельнай вагі дзяржгандлю да 35 проц.

4. Прапанаваць Цэнтрасаюзу прыняць усе неабходныя меры да таго, каб да восені гэтага году былі адкрыты новыя магазыны прадмэтаў харчаваньня (хлеб, мяса, птушка, рыба, гародніна, малочныя прадукты, фрукты) у колькасьці ня менш 200 у Маскве, ня менш як на 150 у Ленінградзе і Данбасе, ня менш як па 100 у Харкаве, Кіеве, Растове, Баку, Ніжнім-Ноўгарадзе, Іванава-Вазьнясенску, Тыфлісе, Сталінградзе, Сьвярдлоўску, Адэсе і Ташкенце і ня менш як па 80 у іншых буйных гарадох і прамысловых цэнтрах СССР.

5. Цэнтрасаюзу, ВСНГ і Народнаму Камісарыяту Забесьпячэньня аднавіць сыстэму папярэдніх заказаў спажкаапэрацыі прамысловасьці.

### II. Вытворчыя прадпрыемствы спажкаапэрацыі

1. Стварыць у сыстэме спажкаапэрацыі вытворчыя аб'яднаньні па наступных галінах:

а) буйныя мэханізаваныя хлебапякарні і хлебазаводы з аб'яднаньнем іх у спэцыяльныя трэсты пры абласных, краявых і рэспубліканскіх саюзах спажкаапэрацыі і з уваходжаньнем іх ва ўсесаюзнае аб'яднаньне хлебапячэньня пры Цэнтрасаюзе;

б) буйныя гародныя, сьвінагадоўчыя, малочныя і птушніцкія гаспадаркі спажкаапэрацыі, якія маюць абласное, агульнагарадзкое ці міжраённае значэньне, з арганізацыяй іх у самастойныя гаспадарчыя аб'яднаньні пры рэспубліканскіх, краявых і абласных саюзах і з забесьпячэньнем удзелу ў іх мясцовага савету і прафсаюзаў.

2. Для разгрузкі спажкаапэрацыі ад неўласьцівых ёй функцый перадаць ад каапэрацыі:

а) прамысловасьць — Народнаму Камісарыяту Забесьпячэньня (акрамя прадпрыемстваў дробнага поўсаматужнага тыпу: вытворства мінэральных вод, перапрацоўка розных харчовых адыходаў ад гандлю і інш.);

б) цырульні і пашывачныя майстэрні — сампрамкаапэрацыі;

в) пральні — гарсаветам.

Перадачу як прамысловых прадпрыемстваў, так і пралень, цырулень і пашываючых майстэрань правесьці з кампэнсацыяй каапэрацыі па адпаведных разрахунках;

г) культурнае абслугоўваньне (кіно-перасоўкі, радыё, бібліятэкі) — Саюзкіно, НКасьветы, Наркампаштэлю; дзіцячыя ўстановы — органам НК Аховы Здароўя і НКасьветы з захаваньнем адпаведных адлічэньняў каапэрацыі на культабслугоўваньне сваіх пайшчыкаў.

### III. Загатоўчая дзейнасьць спажкаапэрацыі

1. НК Забесьпячэньня сумесна з Цэнтрасаюзам вызначыць віды загатовак, па якіх спажкаапэрацыя павінна зьяўляцца асноўным загатоўшчыкам для данай вобласьці (краю, рэспублікі).

2. У мэтах устанаўленьня непасрэднай сувязі паміж буйнымі прамысловымі цэнтрамі і вырабляючымі ра

Ударныя дні будоўлі

# Праектаваньне—слабы вучастак будаўніцтва

## АБ'ЕКТЫ, НЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫЯ ПРАЕКТАМІ, ЗЬНІМАЮЦЦА З ПЛЯНУ РАБОТ

## НЕАДКЛАДНА СКЛАСЬЦІ КАЛЯНДАРНЫЯ ПЛЯНЫ ПРАЕКТАВАНЬНЯ ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ

*Будаўнічыя работы разгарнуць па ўсім фронце. Узяць пад асобны нагляд ударныя пабудовы*

### Улічыць урокі

Сярод мерапрыемстваў, якія забясьпечаюць пасьпяховае ажыцьцяўленьне праграм капітальнага будаўніцтва, важнейшае значэньне набывае ПРАБЛЕМА ПРАЕКТАВАНЬНЯ. Вырашэньне задач будаваць хутка, трывала і танна, ужываць у будаўнічых работах навейшыя дасягненьні тэхніці, нямысьліма бяз выразнай, зведжанай работы органаў праектаваньня, без плянамернай, заўчаснай падрыхтоўкі праектаў, плянаў і чарцяжоў на ўсе аб'екты будаўніцтва.

Між тым, ПРАЕКТАВАНЬНЕ ДА ГЭТАГА ЧАСУ ЗАСТАЕЦЦА СЛАБЫМ ВУЧАСТКАМ БУДАЎНІЦТВА, што нямала садзейнічае саматужніцтву ў рабоце, і, больш таго, проста тармозіць работы па цэлым радзе аб'ектаў будаўніцтва.

Якасьць праектаў у радзе выпадкаў нізкая, маецца непрадумананасьць, павярхоўнасьць, парушэньне тэхнічных норм, што часам выклікае перароблку ўжо зробленых работ.

Але асаблівае недапушчальна стаіць справа з АДСТАВАНЬНЕМ СКАНЧЭНЬНЯ ПРАЕКТАЎ ад тэрмінаў пачатку будаўніцтва. У гэтых адносінах з боку большасьць работадаўцаў наглядаецца недапушчальная нядбайнасьць, спазьненьне, адсутнасьць клопатаў аб своечасовым сканчэньні праектных работ. Брыгаднае абсьледваньне, праведзенае ЦКК РСІ, выявіла рад абураючых фактаў у гэтым напрамку.

Пастанова СНК СССР аб устанаўленьні КАЛЯНДАРНЫХ ПЛЯНАЎ праектаваньня аб'ектаў будаўніцтва, вызначаных паводле пяцігадовага пляну, ня выконваецца. Гэта дэзарганізуе работу органаў праектаваньня, выклікае няроўнамерную нагрузку, стварае сьпешку перад разгортваньнем будаўнічага сэзону, тармозіць ажыцьцяўленьне поўнай увязкі праектнай работы з плянамі будаўніцтва.

Вельмі паказальна, што ў праектнае бюро ВСНГ Беларусі ў студзені месяцы гэтага году заданьняў па праектаваньні паступіла толькі на суму ў 10.500 руб., а ў красавіку — на 50.350 руб. Адносіны некаторых арганізацый да праектаў носяць проста анэкдотычны характар. Так, Белмэтапляб'яднаньне зьявілася з заданьнем праектаваць фабзавуч, які павінен быць пабудован у гэтым годзе, у канцы красавіка, маючы надзею, што праекты будуць скончаны за... ДВА ТЫДНІ. На жаль, такія выпадкі наогул на адзінкавы.

Ня рэдкі выпадкі, калі работадаўцы нясур'ёзна адносяцца да даваемых заданьняў, не прадумваюць да канца характар аб'ектаў, ня ўвязваюць будаўніцтва з тэхнаэканамічнымі працэсамі вытворчасьці. Гэта ўскладняе работу праектуючых органаў, выклікае затрыманьне і неадназовыя ПЕРАРОБКІ праектаў.

Так, праект на машынае аддзяленьне цагельнага парарабляўся тры разы, адэтэваны завод — чатыры разы. Аддзел рацыяналізацыі ВСНГБ запраектаваў будынак з разьлікам цэнтральнага ацяпленьня, а зараз, пры зьмене самога будаўніцтва, адзін будынак застаўся зусім без ацяпленьня, апрача таго аб'ект прыходзіцца перапраектоўваць з разьлікам будаўніцтва там нацельнай. На ацэтонавым заводзе ня была прадугледжана ўстаноўка бакаў у 20 тон для вытворчых патраб, у сувязі з чым усю работу трэба перарабляць.

Ёсьць выпадкі простай нядбайнасьці, што цягне таксама затрыманьні ў праектаваньні. Так, па маргарынавым заводзе меліся няправільныя падлігі, што затрымала работу на некалькі месяцаў, затрымала работу на некалькі месяцаў, сталярная майстэрня Лесбелу «ня ведае», што будзе тут вырабляцца—капёсы, ці што небудзь іншае.

Усім падобнага роду зьявішчам неабходна рашуча паклясьці канец.

ВЯЛІКІЯ НЕДАХОПЫ ЯШЧЭ ЁСЬЦЬ І Ў РАБОЦЕ САМЫХ ОРГАНАЎ ПРАЕКТАВАНЬНЯ. У пэўнай ступені ёсьць стыхійнасьць, здаравнасьць ад плянаў будаўніцтва, нерацыянальнае скарыстаньне кваліфікаванага пэрсаналу. Побач з няўпэўнасьцю ПЕРАЛОМУ ў галіне дастасаваньня стандартаў, нармалаў, тыпавых праектаў і замены жалеза дзеравам, ВЕЛЬМІ МАЛА зроблена для стварэньня матар'яльнай базы па ўжываньні ў праектаваньні НОВЫХ БУДАЎНІЧЫХ МАТАР'ЯЛАЎ (трэпел, шлакі і інш.). Сувязь органаў праектаваньня з работадаўцамі—невыстарчальная. Вельмі спаба прыцягваюцца да ўдзелу ў праектаваньні НАВУКОВЫЯ УСТАНОВЫ. Належнай плянавасьці ў рабоце ўсё яшчэ няма. Так у праектным бюро ВСНГБ плян работы наогул адсутнічае.

Непытна прайсьці міма таго, што існаваньне ў БССР некалькіх разрозненых праектных бюро вядзе да распыленьня сіл спэцыялістаў, спабага скарыстаньня вопыту, кяпоўнага ўжываньня тыпавых праектаў і г. д. Задачы лепшай арганізацыі работы настойліва патрабуюць аб'яднаньня ўсяе праектнае справы ў адных руках, стварэньня АДЗІНАГА ОРГАНУ, які-б мог заняцца ўсімі бакамі гэтага важнейшага пытаньня.

Становішча, якое ёсьць зараз у галіне праектаваньня — ЯЎНА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ. Пастанова СПА СССР ад 10 красавіка г. г. аб абавязковым сканчэньні ўсіх праектаў да 15 мая—нявыканана. Так, па праектным бюро ВСНГ на 1 мая са 102 аб'ектаў будаўніцтва праекты былі толькі па 31. Зусім відавочна, што частка аб'ектаў, у моц тае-ж пастановы, будзе ЗЬНЯТА З ПЛЯНУ БУДАЎНІЦТВА. Падобны факт зьяўляецца разультатам недапушчальнай нераспарадчасьці работадаўцаў, рэзультатам недахопаў у рабоце органаў праектаваньня.

Трэба з усёй рашучасьцю зрабіць усе вынікаючыя адсюль вывады. Пытаньнямі праектаваньня трэба заняцца сур'ёзна. Трэба павесьці рашучую барацьбу з апартуністычнай бязьдзейнасьцю, з падгонкай усёй работы да апошніх дзён перад разгортваньнем будаўніцтва. ПРАЕКТНЫЯ РАБОТЫ ПАВІННЫ РАБІЦЦА КРУГЛЫ ГОД.

Усе наркаматы, трэсты і аб'яднаньні павінны скласьці, на аснове пяцігадовага пляну, КАЛЯНДАРНЫЯ ПЛЯНЫ праектаваньня аб'ектаў будаўніцтва, што забясьпечыць плянамернае правядзеньне ўмацоўчых работ.

Трэба ўмацаваць органы праектаваньня, мацней зьвязаць іх з навуковымі установамі і з работадаўцамі.

Вурокі бягучага году трэба поўнасьцю ўлічыць, не дапусьціць паўтараньня памылак, забясьпечыць своечасовае сканчэньне работ ПА ЎСІХ аб'ектах будаўніцтва.

### Рацыяналізуйце будоўлю

Дарагоўля нашага будаўніцтва надзвычайная і перавышае ўсе іншыя віды прадукцыі. Заданьні па зьніжэньні сабекошту на будоўлі ня выконваюцца. Месцамі мы маем нават падаражэньне. Будаўнічыя арганізацыі пры заключэньні дагавароў заяўляюць старыя цэны на работы, а часамі нават і больш высокія, чым у мінулым годзе. Усё гэта ставіць ва ўпор пытаньне аб рацыяналізацыі будоўлі.

Рацыяналізацыя будоўлі стымулюецца яшчэ і тым, што рад асноўных будаўнічых матар'ялаў стаў дэфіцытным (жалеза, цэмэнт, трубы і інш.), і будоўля ўпіраецца ў пытаньне аб замене іх іншымі—недэфіцытнымі. Прыёмы самой работы на нашай будоўлі вельмі прымітыўныя—прадзедаўскія: яшчэ і да цяперашняга часу цэглу цягнуць на сьпіне з дапамогай дапатопнай «казы», раствор разьмешваюць лапатай у скрынцы і г. д. Па гэтай лініі адкрыта шырокае поле для рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

На нашых буйных будоўлях дасягнуты вялікія рэзультаты ў сэнсе тэмпаў работы. Днепрабуд нават пастаўіў сусьветны рэкорд укладкі бэтону. Але наогул будоўля наша вядзецца яшчэ даволі марудным тэмпамі якія залежаць, галоўным чынам, ад адсталасьці прыёмаў работы.

Мы бачым, што рацыяналізатарская работа на будоўлі мае вялікія пэрспэктывы. Работа гэта павінна пачацца на будоўлі з самага адсталага вучастку—з мэтадаў будаўнічай практыкі. Тое, што ўжо зроблена на лініі мэханізацыі будоўлі, яшчэ зусім невыстарчальна, калі гаварыць аб нашай сярэдняй будоўлі.

Мэханізацыя нашых буйных будаўніцтваў павінна служыць толькі мэтай, да якое мы павінны імкнуцца на іншых будоўлях.

Для будаўнікоў - рацыяналізатараў адкрыты шырокія магчымасьці па ўкараненьні ў будоўлю мэханізмаў, якія забясьпечваюць неабходныя тэмпы работы і якія заменяць нам нехапаючыя рабочыя рукі. Дэфіцытнасьць асноўных будматар'ялаў павінна штурхаць мысьль рацыяналізатараў да замены іх іншымі матар'ялямі, выраб якіх трэба балаваць, галоўным чынам, на мясцовым сырцы. Пры гэтым асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на скарыстаньне адкідаў з розных вытворчасьцяй. Шлак, апілкі, стружкі, салома, кастрыца і інш. павінны знайсьці шырокае ўжываньне пры вырабе новых матар'ялаў.

Роўналежна з увядзеньнем у практыку будаўніцтва новых матар'ялаў стаіць задача па аблягчэньні канструкцый будоўлі. Гэта аблягчэньне і спрашчэньне канструкцый павінна базавацца ў вялікай меры на ўжываньні новых матар'ялаў (цэпла-бэтон і буйна-блочныя каменьні) і даць неабходны эфэкт у сэнсе патаньненьня будоўлі.

Работа рацыяналізатара ў галіне нашай будоўлі павінна забясьпечыць зьніжэньне кошту будаўніцтва, які вельмі павольна падае і ў канчатковым выніку даць патаньненьне будаўнічай вытворчасьці.

Рацыяналізацыя будоўлі павінна прыкаваць да сябе ўвагу рабочых і спэцыялістаў, якія працуюць на нашай будоўлі і шчыра жадаюць папрацаваць над патаньненьнем нашага будаўніцтва.

КУЛЬКІН.

### Тысячы ляцяць на вецер

Чэрэйскі райкамбінат надумаў пабудаваць цагельню. РВК палтрымаў гэту думку. На пабудову асыгнавана 25.700 руб., з якіх пад вэксалі Чэрэйскі РВК атрымаў 13.000 руб. Надыйшла зіма, выпаў сьнег. На заводзе праца спынілася і толькі зараз зразумелі, што 13.000 руб. лопнулі.

Пачалі будаваць завод за 100 мэтраў ад цагельні Сампрамсаюзу, баз усякага вывужэньня запасу гліны. А тая гліна, якая ёсьць ля гэтага заводу, да вырабу цэглы няпрыгодна, бо ў ёй шмат дробных вапнавых каменьняў і калі цэглу-сырэц кладуць у апал, дык гэтыя каменчыкі ў агні разрываюцца і цэгла лопаецца.

На будаўніцтва заводу затрачаны ўсе атрыманыя 13.000 руб., прычым з гэтай сумы выдаткавана на адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі 3.850 руб.

У мінулым годзе на гэтым заводзе выпрацавана 40.000 шт. цэглы, якая зімму праляжала пад сьнегам і дажджом бяз усякай навесі і сточных канаў. У выніку 40.000 цэглін прышлі ў негодасьць, інакш кажучы з гліны зрабілася гліна... Леса і піламатар'ял, які быў загатоўлены для сканчэньня цагельні, раскрадзен невядома кім. Вось чаму лопнулі 13.000 руб. У раёне ёсьць дзьве цагельні і выраблеяя цэгла, а будаваць ільнакамбінат няма чым.

### Тры параходы затрыманы ў рамонце

Гомельская мэблевая фабрыка яшчэ ў мінулым годзе была моцнай гаспадарчай адзінкай. Узброеная добрым мэханічным абсталяваньнем з дастатковай колькасьцю кваліфікаваных рабочых, яна стаяла ў радзе лепшых прадпрыемстваў Гомеля.

Паводле пастаноў урадавых органаў, фабрыка была ў мінулым годзе перадана Дзяржпараходству для абслугоўваньня патраб рэчнага транспарту.

Фабрыка пасьпяхова спраўлялася з ускладзенымі на яе абавязкамі. Яна датэрмінова выканала сустрэчны плян рамонту параходаў, паказала таксама ўзоры гэраічнай барацьбы за выкананьне пляну рамонту ў часе аўралу.

Аднак у апошні час становішча на фабрыцы рэзка зьмянілася. Тры параходы затрыманы ў рамонце. Агульнае становішча на фабрыцы пагражаючае. Яна ня мае ніякіх матар'ялаў для далейшай работы. Закрываюцца цэлыя цэхі, кваліфікаваная рабочая сіла звальняецца. Ужо на працягу некалькіх месяцаў выплата зарплаты рабочым праводзіцца авансамі. На фабрыцы панує безгаспадарчасьць. Каштоўны матар'ял разбазараецца. Ніякага нагляду і кіраўніцтва няма.

Наогул рамонт параходаў злачынна зрываецца. Гэта ў той момант, калі задачы рэканструкцыі рэчнага транспарту патрабуюць узмацненьня работы фабрыкі.

Ва ўсім гэтым вінавата кіраўніцтва Днепра-Дзьвінскага параходзтва, і яго гомельскае аддзяленьне, якія ня цікавіліся і ня кіравалі работай фабрыкі, хаця яна ім і падпарадкавана. Пра кіраўніцтва Дзяржпараходзтва фабрыкай можна судзіць хаця-б па характары распараджэньня, якое атрымана гэтымі днямі ад адміністратара Мурашова: «Прапануем перавесьці фабрыку на гаспадарчы разрахунак. Калі ў вас зараз работ няма, возьмеце заказы з боку». Замест сапраўднага кіраўніцтва і дапамогі, адміністрацыя абмяжоўваецца бюракратычнымі загадамі, прычым не забясьпечвае поўнай нагрузкай фабрыку для патраб рэчнага транспарту.

Далейшае існаваньне фабрыкі ў такіх умовах немагчыма. Фабрыка павінна быць цалкам загружана заказамі для воднага транспарту. Для гэтага ёсьць усе магчымасьці.

Па гэтым пытаньні мы запрашаем выказацца зацікаўленыя арганізацыі.

### Забясьпечыць будаўніцтва дамоў адпачынку

Галоўсаўстрах у гэтым годзе прыступае да будаўніцтва двух буйнейшых дамоў адпачынку у прамысловых цэнтрах БССР—Віцебску і Гомелі коштам у 1.200.000 рублёў кожны.

Яшчэ ў студзені Галоўсаўстрах прапанаваў Белбудканторы заключыць дагавор на будаўнічыя работы, нават быў прыложан праект дагавору, але Белбудкантора запатрабавала 25 проц. зьвыш вызначаных урадам лімітаў. Усе перагаворы Галоўсаўстраху аб зьніжэньні гэтага процанту не здавальняюцца. Заказныя праекты на пабудову гэтых дамоў, якія павінны былі па дагаворы быць гатовымі да 15 красавіка, амаль што не пачаты.

Будаўніцтва дамоў адпачынку ў Віцебску і Гомелі знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

ЗАЦІКАЎЛЕНЫ.

### Зрываецца выраб эфэктыўнай цэглы

Пастановай прэзыдыуму ВСНГБ ад 18-III г. г. быў прызнан неабходным выраб эфэктыўнай цэглы ў разьмерах 40 проц. ад усёй звычайнай цэглы, якая вырабляецца ў БССР. Каб забясьпечыць выкананьне гэтай пастановы, прэзыдыум абавязаў Белбудаб'яднаньне, Белсампрамсаюз і дырэктараў цагельнь мясцовага значэньня прыслаць інстытуту прамысловасьці гліну неабходнай колькасьці для ўтварэньня аналізу апошняй, а таксама даслаць весткі аб магчымасьцях вырабу эфэктыўнай цэглы ў сэнсе пасяўнасьці апілкаў, тарфянога попелу, кастрыцы і інш.

Гэта частка пастановы прэзыдыуму засталася амаль што ня выкананай, бо з усіх цагельнь прамысловасьці БССР, на якіх намечан выраб эфэктыўнай цэглы, толькі каля дзесятка далі гліну на аналіз, прычым у большасьці выпадкаў інстытуту прамысловасьці прышлося пасылаць людзей, каб атрымаць гліну, бо самі заводы яе не дасылалі, а калі і дасылалі, дык бяз усякіх указаньняў аб назначэньні яе і аб налічэньні неабходных да вырабу эфэктыўнай цэглы дадаткаў.

З прычыны гэтага лябараторый інстытуту і керамічная лябараторыя ВСНГБ ня маюць магчымасьці паставіць у належным разьмеры аналізы і выпрабаваньні глін для эфэктыўнай цэглы. Гэта значыць, што яны пазбаўлены былі магчымасьці своечасова даць цагельням патрэбныя паказаньні, зьвязаныя з выпускам эфэктыўнай цэглы. Інстытут прамысловасьці таксама ня мае магчымасьці праводзіць усе вопыты і даць канкрэтныя паказаньні аб формах і відах эфэктыўнай цэглы, аб разьмерах арганічных і неарганічных дадаткаў і наогул выпуску і прыёмкі эфэктыўнай цэглы для БССР.

Становішча, якое ёсьць на сёньняшні дзень, гаворыць аб тым, што справа з вырабам эфэктыўнай цэглы ў гэтым годзе знаходзіцца пад пагрозай. Гэта становішча здарылася з той прычыны, што з боку арганізацый і асоб, якія павінны былі забясьпечыць выраб эфэктыўнай цэглы на цагельнях БССР, у гэтым годзе (г. зн. Будаб'яднаньне, Белсампрамсаюз і дырэктары цагелень), нічога практычнага ня зроблена, каб падвесьці канкрэтную базу пад магчымасьць выкананьня пастановы прэзыдыуму наконт вырабу эфэктыўнай цэглы.

Толькі сэктар кадраў ВСНГБ выканаў пастанову прэзыдыуму аб арганізацыі кароткатэрміновых курсаў па павышэньні кваліфікацыі і перакваліфікацыі адміністрацыйнага і сяроднага тэхнічнага пэрсаналу цагелень.

З-за цяпаніны цагельні своечасова не падрыхтаваліся да вырабу эфэктыўнай цэглы. Трэба вывіць вінаватых у цяганіне, хто сваімі агідным адносінамі зрывае справу забясьпячэньня будаўніцтва эфэктыўнай цэглай, каб прыцягнуць іх да суровай адказнасьці.

### Барысаў не падрыхтаваўся

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Поўны зрыў падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону ў Барысаўскім раёне ставіць пад простую пагрозу выкананьне будаўнічых плянаў 1931 году. Факты красамоўна гавораць аб гэтым.

Белдзяржбудам яшчэ не пачата пабудова фабзавучу гуты імя Домбаля, ня гледзячы на тое, што дагавор паміж Белдзяржбудам і заводам заключан ужо даўно. Пачатак будаўніцтва затрымліваецца з-за адсутнасьці будаўнічых матар'ялаў. Патрэбна вапна. На заводзе яна ёсьць у колькасьці 2 вагонаў, але завод Белдзяржбуду яе не адпускае, хаця гэта і прадугледжана дагаворам.

Будаўнічыя работы на фэрме ЦРК спынены з прычыны недахвату сродкаў. Загатоўленыя матар'ялы валяюцца пад адкрытым небам і хутка прыдуць у негодасьць. У выніку фэрма застаецца бяз сьвінарніка і інтэрнату для рабочых. Завербаваную рабочую сілу зараз трэба распусьціць, бо ёй няма чаго рабіць, а потым, калі ЦРК, нарэшце, падумаецца адпусьціць сродкі для сканчэньня будаўніцтва, гэту рабочую сілу трэба будзе зноў вербаваць.

Такое-ж становішча з пабудовай 36-кватэрнага дому на рабочым пасёлку ў Н.-Барысаве. У 1930 м на будаўніцтве гэтага дому выдаткавана 70.000 руб., але ў сувязі з нястачай сродкаў дом застаецца недабудаваным.

З прычыны адсутнасьці балек і рабочых чарцяжоў Белдзяржбудам не заканчваецца пабудова хлебазаводу ў Барысаве.

Гарсавет парашыў пабудаваць абавязкова ў 1931 г. зараазьлівую больніцу ў горадзе і да гэтага часу ня скончыў дагавору з Белдзяржбудам. Гарсаветам не адпушчаны сродкі, не здабыты матар'ялы для гэтай пабудовы.

У такім-жа стане і будаўніцтва па лініі райвыканкому. Намечана пабудаваць у раёне шмат школ, а лесаматар'ял для іх пабудовы не адпушчан.

Са злачыннай нядбайнасьцю да будаўнічага сэзону адносіцца аддзяленьне Белдзяржбуду. Яно праўляе ў гэтым напрамку недапушчальную павольнасьць. Трэба адзначыць, што ў Белдзяржбудзе недапушчальна пастаўлен улік вопыту будаўнічых матар'ялаў. Напрыклад, на пабудову 36-кватэрнага дому Белдзяржбудам адпушчаны 8 кубамэтры гравія. Бухгальтэрыяй-жа сьпісана 76 кубамэтраў, 73 кубамэтры кудысьці зьніклі.

Толькі самая неадкладная ліквідацыя адзначаных недахопаў можа запэўніць зрыў будаўнічага сэзону ў Барысаве.

ВАЛЬД.



*20-га мая пачынаецца месячнік друку*

# У МЕСЯЧНІК ДРУКУ

## узьнімем ролю рабселькораў-ударнікаў у рабоце саветаў

### Рабкор-ударнік на вытворчасьці і ў друку—ударнік савецкай будоўлі

### Пастановы VI зьезду і задачы фабрычна-заводзкага друку

Буйнейшыя посьпехі, дасягнутыя намі ў «справе індустрыялізацыі і калектывізацыі СССР, дзе сацыялістычны сэктар заняў пануючае становішча ва ўсёй народнай гаспадарцы» — даюць нам поўнае права сьцьвярджаць, што «краіна Саветаў уступіла ўжо у пэрыяд непасрэднага будаўніцтва сацыялізму».

Зьезд саветаў з усёй цьвёрдасьцю запісаў у сваёй пастанове па дакладзе ўраду:

«Няўхільна працягваць і далей палітыку міру... умацоўваючы адначасова абароназдольнасьць савецкай краіны і магутнасьць Чырвонай арміі».

Выходзячы з ацэнкі ўнутранога міжнароднага становішча, VI-ы зьезд саветаў СССР намеціў перад краінай цэлы рад гаспадарча-палітычных задач, якія павінны легчы ў аснову усёй нашай далейшай работы.

Усю нашу работу для ажыцьцяўленьня пастаноў VI зьезду саветаў трэба праводзіць выходзячы з таго, што «мы адстапі ад перадавых краін на 50-100 гадоў і таму «мы павінны перабегчы гэтае тэрмін, або нас самнуць» (Сталін).

Таму з усёй рашучасьцю зьезд запісаў, што

«Пытаньне аб тэмпах мае рашаючае значэньне для цяперашняга пэрыяду і барацьба супроць тэмпаў, якія праводзяцца савецкай уладай, зьяўляецца найбольш характэрнай рысай апартунізму — агентуры нашага клясавага ворага».

«Мы ўступілі ў пэрыяд сацыялізму», будаўніцтва якога патрабуе тэмпаў, тэмпаў і яшчэ раз тэмпаў. Перад прамысловасьцю і транспартам зьезд паставіў наступныя задачы.

Выкананьне прамфінпляну бягучага году ў першую чаргу па важнейшых галінах прамысловасьці (мэталь, вугаль), а таксама па транспарце, стаўным вузкім месцам ўсёй народнай гаспадаркі, якое трэба ва што-б ні стала пераматчы ў найкарацейшы тэрмін, выкананьне пастаўленых перад прамысловасьцю якасных заданьняў і, перш за ўсё, заданьняў па зьніжэньні сабекошту прамысловай прадукцыі, разам з бязумоўным выкананьнем усяго фінан савага пляну і цьвёрдым правядзеньнем фінансавай дысцыпліны мае рашаючае значэньне для ўсёй справы сацыялістычнага ператварэньня нашай краіны».

Адсюль нізавы друк і рабкоры павінны на аснове пастаноў усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху пабудаваць сваю работу так, каб мабілізаваць і арганізаваць масы на бязумоўнае выкананьне заданьняў ураду і партыі.

Для гэтага нізавы друк і рабкоры павінны яшчэ ў большай меры стаць узорам бальшавіцкіх тэмпаў, узорам эканамічнай работы. У пераводзе на канкрэтную мову гэта будзе азначаць, напершае, забясьпечыць, пачынаючы са шматтыражак і канчаючы газавай насьценгазетай, плянавасьць у рабоце і пабудаваць плян такім чынам, каб ён, выходзячы з агульна-заводзкага або цэхавага пляну, быў пабудован пад кутом гледжаньня забясьпячэньня выкананьня задач, якія пастаўлены зьездам. У выніку мы атрымаем плян памножаны на тэмпы.

Рэдкалегіі павінны кожны месяц правяраць ударнымі брыгадамі друку, як даным прадпрыемствам выконваюцца дырэктывы аб паляпшэньні якасьці прадукцыі, зьніжэньне сабекошту, фінансавая дысцыпліна.

Але гэтага мала. Трэба адначасова арганізаваць вытворчыя брыгады добраякаснай прадукцыі, арганізаваць на добраахвотных пачатках масавае зьніжэньне расцэнак, прыток і праверку рацыяналізатарскіх прапаноў, уцягнуць усіх рабочых укладчыкамі ў ашчадкасу, арганізуючы гэтыя касы непасрэдна на прадпрыемствах, неабходна дабіцца правядзеньня ў жыцьцё безнаяўных разрахункаў, своечасовай выплаты ўсякіх узносаў.

Усе гэтыя мерапрыемствы павінны праводзіцца мэтадам сацыялістычнага спаборніцтва праз індывідуальныя або групавыя выклікалі на старонках друку.

Зьезд адзначыў, што:

«Для выкананьня прамфінпляну гэтага году неабходна ўсямернае напружаньне сіл рабочае клясы, дапейшае развіцьцё ударніцтва і сацспаборніцтва і ўзьнясьце іх на вышэйшую ступень, узьняцьце прадукцыйнасьці працы, умацаваньне працоўнай дысцыпліны, шырокае развіцьцё мэханізацыі, стварэньне надраў кваліфікаванай рабочай сілы і спэцыялістаў, аўпаданьне тэхнікай, якая зьяўляецца ключом для вырашэньня асноўных задач разьвіцьця нашай сацыялістычнай індустрыі на цяперашнім этапе».

Адсюль паўстаюць перад нізавым друкам і рабкорамі даўне асноўныя задачы. Па-першае, дасягнуць больш высокіх ступеняй сацспаборніцтва (вытворчыя калектывы, «сквозные» брыгады, грамадзкі буксір). Праверыць выкананьне саддагавораў, арганізаваць і дабіцца ўліку сацспаборніцтва з тым, каб гэты ўлік быў штодзенным, ясным. Па пытаньні аб уліку сацспаборніцтва Зіраім азнаёміцца з вопытам станцыі Зіма, надрукаваным у № 12-13 ад 25 сакавіка «Рабселькора» і прыстасаваць яго да ўмоў сваёй фабрыкі, свайго заводу.

Па-другое, трэба па-сур'ёзнаму ўзяцца за ажыцьцяўленьне задач аўладаньня тэхнікай. Газэта павінна сыстэматычна зьмяшчаць куток тэхнікі, да чаго неабходна прыцягнуць і спэцыялістаў і высокакваліфікаваных рабочых. Гэта старонка павінна стаць трыбунай для абмену вопытам. Трэба дабіцца ахопу ўсіх рабочых тэхнічнымі гурткамі і для тэхнічнай вучобы вызначыць спэцыяльныя дні і гадзіны. Неабходна зьвярнуць увагу на арганізацыю т-ва «Тэхніка — масам» і распаўсюджаньне тэхнічнай літаратуры.

Зьезд адзначыў, што:

«Вялізарныя задачы, што стаяць перад нашай краінай ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, патрабуюць перабудовы ўсёй работы саветаў і савецкага апарату, паваротту тварам іх да вытворчасьці... арганізацыі строгай праверкі фактычнага выкананьня прынятых пастаноў».

Адсюль нізавы друк павінен дапамагчы членам гарсавету ў іх рабоце, высоўваць перад гарсаветам цэлы рад задач, якія вынікаюць з пастановы аб «павароце тварам да вытворчасьці», спрыяць уцягненьню ўдарнікаў і рабкораў у работу сэкцый, перыядычна праз друк заслухоўваць справаздачы членаў гарсавету аб іх практычнай рабоце.

Асаблівы ўпор партыя робіць па праверку выкананьня. Нізавому друку трэба праз арганізацыю ўдарных брыгад, праз арганізацыю кантрольных брыгад праверыць, як на справе праводзяцца пастановы партыі і ўраду, вядучы бязьлітасную барацьбу з нівадамі тымі ў неажыцьцяўленьні дырэктыў тымі, якія тармозяць іх выкананьне.

Нізавы друк і рабкоры павінны праверыць, як каапэрацыя і органы забясьпячэньня перабудавалі сваю работу «пад кутом гледжаньня падпарадкаваньня ўсёй сыстэмы забясьпячэньня інтарэсам сацыялістычнага будаўніцтва і выкананьня прамфінпляну», растлумачыць рабочым апошнюю пастанову ЎсеЦСПС («Праўда» №96, ад 7 красавіка 1931 г.) і сачыць за яе выкананьнем.

Так пастанавіў VI зьезд, паставіўшы перад рабочай клясай і працоўнымі Савецкага Саюзу ганаровую задачу «ажыцьцяўленьня ня больш, як на працягу гэтага дзесяцігодзьдзя лёзунгу — дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны.

Нізавы друк і рабкоры павінны пабальшавіцку ўзяцца, вядучы бязьлітасную барацьбу з правымі і «левымі» апартуністамі, за арганізацыю мас рабочых калгасьнікаў, батрацкоў, беднякоў і сераднякоў на ажыцьцяўленьне пастаноў зьезду, праверыць штодзенна іх выкананьне.

ПАЛІЧАНСКІ.

### Штампоўшчыкі і... зажымшчыкі

Бабруйская газэта «Камуніст» прысла на селькору Ул. Новіку такі адказ: «Ваша заметка «Калі будзе інтэрнат» была расьсьледавана Бабруйскім райінспэктарыятам нарасьветы, які нам паведаміў, што кулацкі дом будзе скарыстан пад майстэрню і што бяднейшыя вучні часткова ахоплены Інтэрнатам».

Як быццам адказ добры, а на самой справе гэта зьдзеек, бо «расьсьледаваньне» гэтае заметкі Бабруйскі райінспэктарыят нарасьветы даручыў таму-ж загадчыку Гарбацэвіцкай ШКМ тав. Шэлянгоўскаму, які абвінавачваўся ў гэтай заметцы. Іншымі словамі заметка трапіла ў рукі таго, пра каго ў ёй пісалася.

Ясна, што гэты адказ зьяўляецца няправільным, бо і зараз яшчэ вучні ахоплены інтэрнатам, толькі часткова, а ніякіх мер да паляпшэньня ня прымаецца.

Такой сыстэме рэагаваньня павінен быць пакладзен канец.

Ул. Новік.

### У часе самаправерні стварылі 5 самаправерачных брыгад

У Попацку самаправерка нізавога друку распачалася. Праведзена гарадзкая нарада рабкораў сумесна з рэдкалегіямі насьценных газэт, на якой створана 5 самаправерачных брыгад.

Самаправерачныя брыгады разам з рэдкалегіямі газэт выпушчаюць спэцыяльныя нумары насьценных газэт, прысьвечаныя выкананьню прамфінпляну першага кварталу і самаправерцы.

ЯЗЭП САЎЧАНКА.

### *Чаму маўчыць „Ленінскі прызыў“*

Зараз у пэрыяд рэканструкцыі народнай гаспадаркі, у пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце і абостранай клясавай барацьбы значэньне друку—магутнага дапаможніка партыі ў правядзеньні яе генаральнай лініі—узрастае яшчэ больш. Ён павінен своечасова падхапляць сыгналы рабселькораў, разгарнуць шырокую арганізацыйна-генаральную работу па аньнічэньні ўсіх недахопаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва. Друк павінен паказаць нашы дасягненьні. Задача друку заключаецца ў тым, каб, змагаючыся такім чынам на перадавых пазыцыях сацыялістычнага будаўніцтва, праводзіць жорсткую барацьбу супроць ухілаў ад лініі партыі, за яе ленінскую генеральную лінію.

На жаль, рэдакцыя газэты «Ленінскі прызыў» (Аршанскі раён) правяла няправільныя, шкодныя адносіны, у прыватнасьці да барацьбы супроць ухілаў ад генеральнай лініі партыі. На запытаньне, чаму так доўга марынуецца матар'ял аб шкодных правеапартуністычных вылазках студэнта Аршанскага тэхстыльнага тэхнікуму тав. Луганіэра, дае адказ, што гэты допіс «будзе зьмешчан тады, калі падбярэцца падобны-ж матар'ял на ўсю старонку газэты». Рэдакцыя гэтым зрабіла бязумоўную памылку, бо такі матар'ял, які павінен мабілізаваць усе рабочыя і працоўныя масы, не павінен ляжаць і чакаць «падборак». Хуткае і тэрміновае зьмяшчэньне—удар па апартуністах—выпраўленьне памылак зьяўляецца неадкладнейшай неабходнейшай справай.

ГАНТМАН.

# Стандарту--ганаровае месца

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне сацыялістычнага будаўніцтва, ператварэньне Савецкага Саюзу з краіны аграрна адсталай у перадавую індустрыяльную, выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, задача дагнаць і перагнаць у найкарацейшы час тэхнічна перадавыя капіталістычныя краіны — вымагае надзвычай напружанай работы ад усяе рабочае клясы, ад усіх працоўных. Для кутчэйшага ажыцьцяўленьня ўсяго гэтага трэба скарыстаць усе магчымасьці. Трэба больш рацыянальна пабудаваць усю работу, больш поўна скарыстоўваць усе дасягненьні тэхнікі. Недарма вакол нашага вузкага месца, вакол справы аўладаньня тэхнікай, камуністычная партыя мабілізуе шырокія масы савецкай грамадзкасьці. «Бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай. Тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі рашае ўсё» (СТАЛІН).

І вось мы павінны прызнаць, што адным з галоўных прыёмаў, які дапамагае рабочай клясе аўладаць сацыялістычнай тэхнікай, ёсьць стандарт.

Стандарт ва ўмовах плянавай гаспадаркі пралетарскай дзяржавы ёсьць норма, ёсьць жорсткі закон, які акрэсьлівае, якой павінна быць прадукцыя ўсёй нашай вытворчасьці, акрэсьлівае формы, разьмеры і якасныя паказальнікі рэчаў вытворчасьці. Стандарт паказвае і дае ўзоры, як трэба праводзіць тэхнічнае праектаваньне ў прамысловасьці, транспарце, сельскай і наогул усёй народнай гаспадарцы, паказвае, якое патрэбна для розных вытворчасьцяй і розных выпадках абсталяваньне, як трэба яго расставіць і як ім карыстацца, вызначае мэтады вытворчых працэсаў. Пры дапамозе савецкіх законаў і сацыялістычнай тэхнікі ў вытворчасьці плюс стандарт можна арганізаваць народную гаспадарку такім парадкам, што паасобныя часткі яе будуць даваць прадукцыю, якая ў сваю чаргу поўнасьцю на сваіх асноўных паказальніках, асартыменту, разьмерах і якасьці будзе здавальняць патрэбы вытворчасьці і інтэрэсам спажыўца. Стандарт у савецкай краіне — гэта апошня

# ЗАСТАЛОСЯ 16 РАШАЮЧЫХ ДЗЁН

# НЯ МЕНШ 130.000 ГЭКТАРАЎ ЗАСЯВАЦЬ ШТОДЗЕННА!

## У ЖЛОБІНЕ ЗАМЕСТ АРГАНІЗАЦЫІ СУСТРЭЧНЫХ ПЛЯНАЎ СКАРАЧАЮЦЬ ПЛЯНЫ ПАСЕВУ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР

## ПАД СУД ЗРЫЎШЧЫКАЎ ПЛЯНАЎ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ, ЯКІЯ ГРАЮЦЬ НА-РУКУ КЛЯСАВАМУ ВОРАГУ!

### Максымальна скараціць тэрміны сяўбы

Усе раёны БССР уступілі ў пэрыяд масавай сяўбы. Цёплае надвор'е спрыяе і спрыяе энэргічнаму разгортваньню палявых работ і максымальнаму скарачэньню тэрмінаў сяўбы.

Аднак, першая зводка НКЗБ на 10 мая паказвае, што на месцах сяўба разгортваецца вельмі марудна. У першыя дні засеяна толькі 95.445 гэкт., або 3,6 проц. выкананьня пляну. Наперадзе ідуць саўгасы і калгасы. Затое аднаасобны сэктар значна адстае, які засеяў 3 проц. пляну. Прыклад ганебнага адставаньня паказваюць і МТС, дзе плян выкананы толькі на 1,9 проц. пры сярэднім у 3,6 проц. Гэта ганебнае адставаньне МТС і маруднасьць разгортваньня сяўбы наогул пагражаюць сваячасоваму сканчэньню веснавой кампаніі.

У часе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы мы мелі рад фактаў, калі некаторыя раённыя арганізацыі імкнуліся скараціць пляны пасеву. Гэтым апартуністычным імкненьням, на жаль, ня ўсюды яшчэ дан рашучы адпор. Сёньня мы ўжо зьяўляемся сьведкамі праяўленьня гэтага махровага апартунізму на практыцы. У Жлобінскім раёне некаторыя калгасы прыступілі да скарачэньня пасеўных пляшаў. Апартуністы всаблівa імкнуцца выжыць тэхнічныя і сіласныя культуры. На жаль, раённыя арганізацыі ня бачаць у гэтых фактах простай пагрозы спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі.

Нікуды ня варта і такая работа, што на сёньнішні дзень пасеўныя пляны даведзены да двароў толькі на 93 проц., а па калгасах — на 83 проц. Іграмадзканьне асноўных сродкаў вытворчасьці, асабліва ў коваарганізаваных калгасах, усё яшчэ адкладваецца апартуністамі. У выніку забясьпечанасьць калгасаў цягавай сілай вельмі нізкая. На 1-га студзеня г. г. на адзін двор у калгасах прыпадала 0,78 каня, а на 10 мая —толькі 0,69 каня. Гэтай недаацэнцы гаспадарчага замацаваньня калгасаў трэба даць рашучы адпор. Палажыць канец кулацкай папітыцы, якая накіравана на падрыў эканамічнай моцы калгасаў.

Плян кантрактацыі яравых, ня гледзячы на тое, што ўсе тэрміны прайшлі, яшчэ ня выкананы. На 10 мая яравых зкантрактавана 84,8 проц. пляну, а па Ільне—толькі 76,7 проц. Прычынай зрыву своячасовага сканчэньня кантрактацыі яшчэ і да гэтага часу застаецца апартуністычная недаацэнка масавай работы і слабае разгортваньне папулярызацыі адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі сярод калгасных і бядняцка-сераднякіх мас.

Да канца сяўбы застаўся 16 дзён, якія зьяўляюцца рашаючымі днямі. Перад намі стаіць задача засяваць 130.000 гэкт. штодзенна, каб своячасова засеяць яравы клін на плошчы 2.674.226 гэктараў.

Выкананьне задач пасеўнай кампаніі магчыма пры максымальным напружаньні сіл усіх вясковых арганізацый. Трэба ліквідаваць непаладкі, якія перашкаджаюць палявым работам, перавесьці ўсе калгасы да 25 мая на зьдзельшчыну, ліквідаваць абязьлічку, дабіцца максымальнага скарыстаньня сродкаў вытворчасьці і поўнага выкананьня норм выпрацоўкі калгасьнікамі і рабочымі МТС. Дырэктывы вышэйшых органаў аб тым, што трактар павінен працаваць 21 гадзіну ў суткі, павінны быць праведзены ў жыцьцё.

Разгортваньнем сацспаборніцтва на аснове зьдзельшчыны паміж калгасамі, саўгасамі і МТС мабілізаваць калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх масы вёскі, даць адпор кулаку і яго агентам—апартуністам, якія імкнуцца скараціць пляны пасеву, і дабіцца поўнага засеву яравога кліну.

### За пяцідзённую па віне магілеўскіх апартуністых—не закантрактавана ніводнага гэктара

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.).

Становішча ходу кантрактацыі па раёне прымушае яшчэ раз біць трывогу. Здавалася-б, што 57,9 проц. выкананьня кантрактацыі, якія былі на 25 красавіка, павінны былі ўзварушыць усю прапагандысцкую грамадзкасьць раёну і, у першую чаргу, партыйную арганізацыю райвыканком і райкаапсаюз.

Між тым, на справе аказалася, што апартуністычныя адносіны да кантрактацыі ня зжытыя. Калі праз пяць дзён, на 30-IV, выкананьне пляну кантрактацыі павялічылася на 2,9 проц., дык у другую пяцідзённую, з 1 ПА 5 МАЯ ЗУСІМ НЕ ЗАКАНТРАКТАВАНА НІВОДНАГА ГЭКТАРА.

Асаблівай бязьдзейнасьцю і апартуністычнымі адносінамі да кантрактацыі вызначаюцца МАХАЎСКІ, СЛАБОДЗКІ і ГЛУШКАВІЦКІ сельсаветы, якія да ГЭТАГА ЧАСУ НЕ ЗАКАНТРАКТАВАЛІ НІВОДНАГА ГЭКТАРА.

Раённая партыйная арганізацыя, райвыканком, сельсаветы, райкаапсаюз павінны зараз-жа мабілізаваць усю грамадзкасьць на выкананьне пляну кантрактацыі. Неабходна асаблівую ўвагу зьвярнуць на кантрактацыю тэхнічных культур, ільну, канапель і бульбы, процант выкананьня якіх вельмі нізкі.

МАГІЛЕЎСКІ РК КП(б)Б ПАВІНЕН НЕАДКЛАДНА ЗАНЯЦЦА СПРАВАЙ КАНТРАКТАЦЫІ, ЗАБЯСЬПЕЧЫЎШЫ ПАСЬПЯХОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯКАВЫХ ЗАДАНЬНЯЎ.

ПРАХАРЭНКА.

### ЗВОДКА НКЗБ

*аб ходзе веснавой сяўбы па становішчы на 10 мая 1931 г.*)*

| Сэктары і сыстэмы | Усяго яравых беспакроўных у гэкт. | | | З іх па (у процантах да пляну) | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Плян | Засеяна | Проц. выканн. | Збожжавых | Тэхнічных | Бульбы |
| а) саўгасамі | 109090 | 5814 | 5,3 | 6,8 | 0,7 | 4,2 |
| б) калгасамі | 833599 | 37265 | 4,5 | 6,7 | 0,5 | 1,5 |
| в) аднаасобнікі | 1731537 | 52366 | 3,0 | 3,1 | 1,1 | 2,5 |
| Усяго па БССР | 2674226 | 95445 | 3,6 | 4,2 | 0,8 | 2,2 |
| З іх па Белсельтрэсьце | 40118 | 919 | 2,3 | 4,5 | — | 0,7 |
| » » Бел. кан-ры Сьвінавод | 32502 | 949 | 2,9 | 2,1 | — | 0,5 |
| » » Бел. кан-ры Насенавод трэсту | 9527 | 565 | 5,9 | 13,4 | — | — |
| » » Беларусьляненьне Галоўленкому | 7507 | — | — | — | — | — |
| » » Белкаапсаюзе | 13939 | 309 | 2,2 | 0,4 | — | 1,5 |
| » » Саюзхлебе | — | — | — | — | — | — |
| » » Беларусьляненьні Маслатрэсту | 1156 | — | — | — | — | — |
| Усяго па сыстэмах | 104749 | 2742 | 2,6 | 4,2 | — | 0,6 |
| Беларусьляненьне Трактарацэнтру | 203390 | 3913 | 1,9 | — | — | — |

*) Паводле матар'ялаў 80 раёнаў

### 84.8 проц. пляну закантрактавана яравых

*Бліжэйшыя дні павінны зьявіцца баявымі днямі па скончэньні кантрактацыі*

Зводка Наркамзнабу аб ходзе кантрактацыі на 11 мая сьведчыць, што раённыя арганізацыі ўсё яшчэ па-баявому не ўзяліся за выкананьне пляну кантрактацыі, БССР паранейшаму адстае ў выкананьні пляну кантрактацыі параўнальна з іншымі рэспублікамі і абласьцямі Саюзу.

На 11 мая плян кантрактацыі яравых пасеваў выканан толькі на 84,8 проц.

Кантрактацыя збожжавых культур павінна была быць скончана яшчэ 15-га красавіка. Між тым, на 11 мая закантрактавана толькі 82,3 проц. пляну.

На асобных культурах плян кантрактацыі збожжавых культур выканан: па аўсе—73,7 проц., па ячменю—76 проц., па гароху і фасолі—93,1 проц. і па крупяных культурах—130,9 проц.

Злачынна марудна разгортваецца кантрактацыя сена. На 11 мая плян кантрактацыі сена выканан толькі на 35,7 проц., прычым рад раёнаў да гэтай работы яшчэ нават не прыступіў.

Дырэктыва партыі і ўраду аб скончэньні кантрактацыі тэхнічных культур да 5-га мая ня выканана. На 11 мая плян кантрактацыі ільну выканан на 76,7 проц., канапель—93,7 проц. і бульбы—95,1 проц.

Ленш праходзіць кантрактацыя гародных культур. На 11 мая плян кантрактацыі капусты выканан на 113 проц., буракоў—169 проц., цыбулі—94,6 проц., гуркоў—88,7 проц. і махоркі—81 проц.

Такія тэмпы выкананьня пляну кантрактацыі зьяўляюцца злачынными. Сяўба, якая ўжо разгарнулася па ўсіх раёнах БССР, вымагае безадкладнага скончэньня кантрактацыі і афармленьня дагавораў.

Больш марудзіць нельга. Кожны дзень адтэрмінаваньня ў выкананьні пляну кантрактацыі зьяўляецца ўдарам па разгортваньні пасеўнай кампаніі. Раённыя арганізацыі павінны ў бліжэйшыя дні скончыць кантрактацыю.

### МОЦНЫЯ КАЛГАСЫ ДАПАМАГАЮЦЬ СЛАБЫМ

#### Кулацка заможныя гаспадаркі павінны выканаць цьвёрдыя заданьні па сяўбе

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Наш кар.). Калгасы Мазалаўскага сельсавету дружна выйшлі ў поле і ўдарнымі тэмпамі праводзяць веснавую сяўбу.

У калгасах вёсак Тураўка, Глазаўшчына, Мазалава да 10 мая ўзорана каля 50 проц. яравога кліну. Рад калгасаў распачаў масавую сяўбу раньніх яравых—пшаніцы, ячменю і аўса. Больш моцныя калгасы дапамагаюць слабым, прадстаўляючы апошнім цягавую сілу.

Індывідуальны сэктар параўнальна з калгасным значна адстае. Кулацка-заможныя гаспадаркі ўсякімі спосабамі імкнуцца сарваць пляны сяўбы.

Масавая работа на палёх як сярод калгасьнікаў, так і індывідуальнікаў вядзецца слаба. Гэтым карыстаецца кулак у сваёй антыкалгаснай агітацыі.

Раённыя арганізацыі і сельсаветы павінны зьвярнуць больш увагі на індывідуальны сэктар, каб папярэдзіць пагрозу недасеву яравога кліну ў радзе сельсаветаў.

Трэба дабіваца, каб кулацка-заможныя гаспадаркі выканалі свае цьвёрдыя заданьні па засеву.

Неабходна ўжыць усе захады да засеву бросавых зямель, якіх у раёне ёсьць значная колькасьць.

М.

### Апартуністы з Жлобінскага раёну

#### на практыцы скарачаюць пасеўпляны

*Прыцягнуць да суровай адказнасьці за скарачэньне плянаў посеву тэхкультур*

ЖЛОБІН. (Наш кар.). На 10 мая адпаасобным і калгасным сэктарам засеяна 2.220 гэкт. Па збожжавых — 1.314 гэкт., ільне—188 гэкт., траў—150,5 гэкт., бульбы—523.

З боку некаторых калгасаў назіраецца імкненьне зьнізіць пасеўныя плошчы пад лён. Ёсьць таксама імкненьні сеяць лён на горшай зямлі. Ня зьніштаны яшчэ разважаньні, што ва ўмовах Жлобінскага раёну лён ня можа даць добрага ўраджаю.

Так, калгас «Чырвоная Беларусь» лепшую землю адвёў пад пасеў збожжавых культур, а пад лён пакінуў найгоршы вучастак зямлі.

Некаторыя калгасы зьніжаюць таксама плошчы пасеваў сіласных культур. Калгас «Рассьвет—пераможца» адмовіў пасеву сланечніка на 2 гэкт. калгас «Кастрычнік» зусім адмовіўся атрымаць насеньне сіласных культур. Раённыя арганізацыі не вядуць рашучай барацьбы з настроямі зьніжэньня пасеваў тэхнічных і сіласных культур.

Вельмі дрэнна стаіць справа з забесьпячэньнем пасеваў сіласных культур насеньнем. Паводле пляну павінна быць засеяна 700 гэкт., а адпушчана ўсяго на сеньня на 234 гэкт., у сувязі з чым плян пасеву сіласных культур ня выконваецца.

Асобныя калгасы адчуваюць недахват у пасеўнай бульбе. У калгасах «Чырвоная Беларусь», імя 12-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, імя Войкава з-за нядбайных адносін шмат бульбы папсавалася і да гэтага часу яшчэ ня вырашана пытаньне, ці будуць гэтыя калгасы забясьпечаны насеньнем бульбы.

Па некаторых калгасах адчуваецца таксама недахват пасеўнага аўса.

Паасобныя саўгасы нічога ня робяць для абмену простага аўса на гатунковы. Ёсьць абурачыя факты, калі гатункове насеньне ідзе на адкорм жывёлы. Так, калгас «Чырвоны партызан» значную частку гатунковага аўса скарыстаў на адкорм жывёлы, у той час, калі тут-жа пад бокам пад калгасаў ня мае гатунковага аўса.

Машніцкі.

### ТЭМПЫ СЯЎБЫ НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫ

#### *50 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак Койданаўшчыны ў калгасах*

КОЙДАНАВА. (Ад нашага спэц. кор.). Першая дэкада мая ў сувязі з пачаткам палявых работ, якая суправаджаецца ўзмацненьнем масавай работы дала бурны прыліў у калгасы—9 проц.

На 1-га мая Койданаўшчына налічвала ў калгасах 39 проц., а на 16 ужо каля 48 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Такім чынам раён у асноўным ужо выканаў намячэньне партыі аб 50-процантнай калектывізацыі раёнаў, якія абслугоўваюцца МТС. Бясспрэчна, што на сёньнішні дзень гэта заданьне Койданаўскім раёнам ужо выканана.

Неабходна, аднак, адзначыць, што тэмп сяўбы першай дэкады мая быў яўна нездавальняючым, калгасы выканалі толькі 3,4 проц. пасеўнага пляну, а аднаасобнікі—0,7 проц.

Асноўнай прычынай зьяўляецца адсутнасьць бядняка-сераднякоў шмат бульбы папсавалася і да гэтага часу яшчэ ня вырашана пытаньне, ці будуць гэтыя калгасы забясьпечаны насеньнем бульбы.

Па некаторых калгасах адчуваецца таксама недахват пасеўнага аўса.

Паасобныя саўгасы нічога ня робяць для абмену простага аўса на гатункові. Ёсьць абурачыя факты, калі гатункове насеньне ідзе на адкорм жывёлы. Так, калгас «Чырвоны партызан» значную частку гатунковага аўса скарыстаў на адкорм жывёлы, у той час, калі тут-жа пад бокам пад калгасаў ня мае гатунковага аўса.

Машніцкі.

### ТЭМПЫ СЯЎБЫ НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫ

#### *50 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак Койданаўшчыны ў калгасах*

КОЙДАНАВА. (Ад нашага спэц. кор.). Першая дэкада мая ў сувязі з пачаткам палявых работ, якая суправаджаецца ўзмацненьнем масавай работы дала бурны прыліў у калгасы—9 проц.

На 1-га мая Койданаўшчына налічвала ў калгасах 39 проц., а на 16 ужо каля 48 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Такім чынам раён у асноўным ужо выканаў намячэньне партыі аб 50-процантнай калектывізацыі раёнаў, якія абслугоўваюцца МТС. Бясспрэчна, што на сёньнішні дзень гэта заданьне Койданаўскім раёнам ужо выканана.

Неабходна, аднак, адзначыць, што тэмп сяўбы першай дэкады мая быў яўна нездавальняючым, калгасы выканалі толькі 3,4 проц. пасеўнага пляну, а аднаасобнікі—0,7 проц.

Асноўнай прычынай зьяўляецца адсутнасьць бядняка-сераднякоў шмат бульбы папсавалася і да гэтага часу яшчэ ня вырашана пытаньне, ці будуць гэтыя калгасы забясьпечаны насеньнем бульбы.

Па некаторых калгасах адчуваецца таксама недахват пасеўнага аўса.

Паасобныя саўгасы нічога ня робяць для абмену простага аўса на гатункові. Ёсьць абурачыя факты, калі гатункове насеньне ідзе на адкорм жывёлы. Так, калгас «Чырвоны партызан» значную частку гатунковага аўса скарыстаў на адкорм жывёлы, у той час, калі тут-жа пад бокам пад калгасаў ня мае гатунковага аўса.

Машніцкі.

### 1448 новых калгасьнікаў за дэкаду

КАСЬЦЮКОВІЧЫ, 11.

Па КАСЬЦЮКОВІЦКІМ раёне на 11 мая калектывізавана 54 проц. гаспадарак. У апошнюю дэкаду прыліў у калгасы даў 1.448 гаспадарак. Калгасамі засеяна 2.664 гэкт. што складае 7 проц. пасеўнага пляну.

Арышанаў.

### Прыклады ўвядзеньня зьдзельшчыны папулярызуюцца сярод аднаасобнікаў

ВУШАЧЫ. (Наш кар.).

2-га мая пачаўся масавы выхад калгасаў у поле. У першыя дні выхаду ў поле калгасьнікі паказалі сваю гатоўнасьць поўнасьцю выканаць пляны сяўбы. Ударныя тэмпы працы на калгасных палёх выклікаюць новую хвалю калгаснага прыліву.

У першую пяцідзёўку работы на палёх беднякі і сераднякі падаюць заявы аб прыёме іх у калгас. У калгас «Новае жыцьцё» прынята 4 гаспадаркі, у калгас «Новы шлях»—26 гаспадарак. У нацыянальны латыскі калгас «Цэпітнэ» ўступіла 10 гаспадарак, у калгас імя Парыскай камуны» — 16, у «Чырвоную зьвязду»—14, у «Сяко і Ванцэці»—9 гаспадарак.

У Мазырскім сельсавеце арганізаваны 3 новыя калгасы, у Жарскім сельсавеце—1. У Кубліцкім сельсавеце, на самой мяжы, арганізаваны новы калгас. У Вісьніцкім сельсавеце—2 калгасы.

Вялікую ролю ў арганізацыі новага калгаснага прыліву адыграў пераход калгасаў на зьдзельшчыну, якая арабіла рэдкі пералом у арганізацыі працы калгасу. Прыклады ўвядзеньня зьдзельнай працы ў калгасах папулярызуюцца сярод беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў.

Ліпаўка Я., Гінзбург Я.

### Апартуністы з саўгасу Боркі-Бялевічы зрываюць сяўбу

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА, 9.

Саўгас Боркі-Бялевічы да гэтага часу не прыступіў да сяўбы. Між тым, згодна пляну, веснавой сяўбы трэба ўзараць і засеяць 400 гэкт.

Прысланы яшчэ ў сьнежні 1930 году трактар скарыстоўваўся для прагулак. На ім па снягу каталіся, кто толькі хацеў, а 1 мая, калі трэба было выяжджаць на поле, ён сапсаваўся і зараз бязьдзейнічае.

Коні, якія маюцца ў саўгасе, амаль што кожны дзень пасылаюцца ў Слуцак за 28 клм. на перавозку розных грузаў. Перавозка ўсяго грузу ў колькасьці 8 вагонаў займе яшчэ 2 тыдні.

Калі і далей коні будуць скарыстоўвацца на перавозку грузаў, ня будзе выканана дырэктыва партыі і ўраду аб скончэньні сяўбы ў саўгасе да 20 мая.

Рабочы.

### Больш увагі новаарганізаваным калгасам

Паводле зводкі Наркамзему на 11 мая, па БССР налічваецца 7.003 калгасы, якія аднаюць 217.214 бядняцка-сераднякіх гаспадарак, што складае 28 проц. калектывізацыі.

Горш праходзіць абагуленьне рабочай жывёлы. Тэмпы абагуленьня рабочай жывёлы адстаюць ад тэмпаў калектывізацыі. На 11 мая абагулена 150.395 штук рабочай жывёлы.

Ня гледзячы на разгорнутую сяўбу, пасеўныя пляны ўсё яшчэ поўнасьцю не даведзены да асобных гаспадарак і да калгасаў. На 11 мая пасеўныя пляны да аднаасобных гаспадарак даведзены на 93 проц., да калгасаў на 83,5 проц. Горш за ўсё пасеўныя пляны даводзяцца да новаарганізаваных калгасаў.

### Калгас „Перамога" ўключыўся ў конкурс

КОЙДАНАВА. (На тэлефону ад нашага спэцкора).

Вітаючы пастанову ЦК КП(б)Б аб арганізацыі ўсебеларускага конкурсу ўдарнага правядзеньня веснавой сяўбы, партарганізацыя Койданаўшчыны робіць гэту пастанову важнейшай зброяй барацьбы за посьпех бальшавіцкай вясны, за максымальнае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах, на аснове зьдзельшчыны, ацэнонай у працаднёх. МТС парашыла ўжо ўключыцца ў конкурс, маючы мэтаю неадкладна ліквідаваць усе выяўленьня ў першыя дні сяўбы прарывы.

Новы калгас «ПЕРАМОГА» ўключыўся ў конкурс, абавязаўшыся закончыць сяўбу не пазьней 25 мая, выходзіць на поле ў 6 гадзін раніцы, замест 7-мі. Калгасьнікі адмовіліся ад выхадных дзён і выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва калгас «Бальшавіцкая сяўба».

Сёньня ў радзе калгасаў і саўгасаў Койданаўшчыны на абмеркаваньне агульных сходаў калгасаў і саўгасаў стаіць пытаньне ўключэньня ў конкурс.

ЛІЛІН.

## *Ільнаводчыя раёны БССР— за вамі слова!*

### У БОЙ ЗА ПАСЕУ 240.000 ГЭКТАРАЎ ІЛЬНУ І 40.000 ГЭКТАРАЎ КАНАПЕЛЬ!

*Арганізацыяй сустрэчных плянаў і спаборніцтва будзем змагацца за вырашэньне праблемы тэхкультур, дамо сырэц сацыялістычнай прамысловасьці*

### АДОЗВА ДРУКУ ЗАХОДНЯЙ І ЛЕНІНГРАДСКАЙ АБЛАСЬЦЕЙ ДА ЎСІХ ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАЎ

Вырашэньне праблемы тэхнічных культур, а тым самым і стварэньне магутнай сырцовай базы для лёгкай індустрыі, якая абслугоўвае патрэбы прамысловасьці і ўзрастаючыя патрэбнасьці шырокіх мас працоўных, зьяўляюцца ў цяперашні момант, побач з праблемай жывёлагадоўлі, прадметам асаблівай увагі і клопатаў усёй партыі, усёй пралетарскай дзяржавы.

Шырокае разьвіцьцё ільнаводзтва, якое зьяўляецца сустаўной і важнейшай часткай праграмы разьвіцьця тэхнічных культур, упіралася да гэтага часу ў абмежаваныя магчымасьці дробна-таварнай індывідуальнай сялянскай гаспадаркі, у дапатопныя прыёмы і тэхніку ўборкі і апрацоўку ўраджаю ільну, у вялізарную працаёмкасьць гэтай культуры і г. д.

Буныя тэмпы калектывізацыі, падвядзеньне пад ільнаводчую гаспадарку магутнай тэхнічнай базы, прынятая ўрадам і ЦК партыі разгорнутая праграма, якая пасьпяхова ажыцьцяўляецца, індустрыялізацыя ільнаводзтва ў відзе стварэньня МТС ва ўсіх асноўных ільнаводчых раёнах, будаўніцтва заводаў першапачатковай апрацоўкі ільну, завозу ільнацерабілак, шырокага ўкараненьня мінэральных угнаеньняў — усё гэта адкрывае ўпаршыню сапраўды шырокія перспэктывы разьвіцьцю ільнаводзтва як у часьці засеваньня новых вялізарных плошчаў пад лён, так і росту ўраджайнасьці і ўздыму тэхнікі ільнаводзтва на вышыню, якая цалкам адпавядае пастаўленай партыяй і ўрадам задачы — «дагнаць максымум за дзесяць год самыя перадавыя ў тэхніка-эканамічных адносінах капіталістычныя краіны».

Уся труднасьць вырашэньня гэтай задачы рашаючую ролю павінна адыграць шырокае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва, як асноўнага мэтаду штодзённай барацьбы за лён усіх арганізацый, і мабілізацыя шматмільённых мас ільнаводаў калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Роля і задачы ўсяго друку ільнаводчых раёнаў, пачынаючы з абласных і раённых газэт і канчаючы насыщанымі газэтамі і шматтыражкамі ў саўгасах, калгасах і населішчах, стаць у першыя рады арганізатараў гэтай барацьбы за бальшавіцкія тэмпы разьвіцьця ільнаводства, стаць на справе арганізатарамі спаборніцтва за высокія колькасныя і якасныя паказальнікі вытворства ільну, арганізаваць шырокі абмен вопытам, паказ лепшых форм і мэтадаў барацьбы за лён перадавых абласьцей і раёнаў, перабудаваўшы адпаведна работу самага друку.

Заходняя вобласьць — асноўная ільнаводчая база Савецкага Саюзу — якая пашырае ў гэту вясну свой ільняны клін на 45,6 проц. і даводзіць пасеўную плошчу пад лён да 560.000 гэктараў, у твары яго абласных газэт: «Рабочий путь», «Социалистическая деревня», Большевистский молодняк», «Областной радио-газеты» і раённай газэты ільнаводчай Віцебшчыны «Большевистский путь», — выклікала на ільняную пераклічку сумежную з ёй Ленінградзкую вобласьць, якая зьяўляецца і па разьмерах сваіх ільняных плошчаў (257.000 гэкт.) па выхадзе таварнай прадукцыі і па якасьці ільну другой ільнаводчай вобласьцю ў СССР.

Узаемна ўключыўшыся ў гэту пераклічку і сабраўшыся ў Ленінградзе ў рэдакцыі «Ленінградзкой правды» для распрацоўкі канкрэтнай праграмы дзеяньняў у барацьбе за лён, прадстаўнікі абласных газэт Заходняй вобласьці — «Рабочий путь», «Соц деревня», «Большевистский молодняк» і «Радиогазеты» — і абласных газэт Ленінградзкай вобласьці —«Ленинградской правды», «Крестьянской правды» і «Смены» пры ўдзеле прадстаўнікоў абласных ваенных і калгасна-кааперацыйных органаў абедзьвюх абласьцей і прадстаўнікоў калгасаў ільнаводчых раёнаў Заходняй вобласьці лічаць неабходным перагаварыць гэту пераклічку дзьвёх абласьцей ва «усесаюзную ільняную пераклічку» ўсіх ільнаводчых раёнаў Саюзу, для таго, каб злучаньнямі намаганьнямі друку і арганізацый ільнаводчых раёнаў, на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, з найбольшым посьпехам і ў найкарацейшыя тэрміны дабіцца вырашэньня праблемы ільну ў поўнай адпаведнасьці з пастановамі XVI зьезду партыі.

Мы, абласныя газэты Заходняй і Ленінградзкай абласьцей, выклікаем абласьцей, выклікаем абласныя газэты Масквы, Івана-Вазьнясенску, Беларусі, Уралу, Ніжняга Ноўгараду, Заходняй Сібіры ўключыцца ва ўсесаюзную ільняную пераклічку, паставіўшы барацьбу за лён у цэнтр работы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі сваіх раёнаў і сельска-гаспадарчых кампаній 1931 году, трэцяга году пяцігодкі.

Выклікаем увесь абласны і раённы друк пералічаных абласьцей арганізаваць гэту пераклічку на аснове самага шырокага ўнутрыабласнога спаборніцтва раёнаў, сельсаветаў, саўгасаў, калгасаў і ўстанаўленьня непасрэднай сувязі па пераклічцы раённых газэт саўгасаў, калгасаў, ільнаводчых абласьцей і раёнаў, якія спаборнічаюць паміж сабою.

Узяўшы на сябе пачын у арганізацыі ўсесаюзнай пераклічкі, мы, абласныя газэты Заходняй і Ленінградзкай вобласьці, паставілі перад сабой наступныя асноўныя задачы:

**Уцягнуць** у гэту пераклічку ўсе раённыя газэты ільнаводчых раёнаў, усю армію калгаскораў і селькораў, ільнасаўгасы і калгасы.

**Арганізаваць** грамадзкі буксір перадавых раёнаў, сельсаветаў, ільнасаўгасаў і калгасаў над адстаючымі.

**Арганізацыяй** сустрэчных плянаў зьнізу забясьпечыць поўнае выкананьне праграмы сяўбы ільну.

**Арганізаваць** масавы грамадзкі кантроль самых пасеўшчыкаў—ільнаводаў аднаасобнікаў за выкананьнем самаабавязацельстваў па сяўбе і абавязацельстваў па кантрактацыі ільняных пасеваў праз брыгадныя самаправеркі.

**Разгортваем** неадкладна шырокую падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі, скансэнтраваўшы галоўную сваю ўвагу на арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў, на паўсюдным ўвядзеньні ў іх зьдзельшчыны, на распрацоўцы норм выпрацоўкі, адпаведных фактычнай выпрацоўцы лепшых калгасьнікаў, лепшых калгасных брыгад, на пільным вывучэньні вопыту зьдзельшчыны ў парыяд сяўбы ільну і зьніжэньні ўсіх недахопаў пры канчатковым складаньні норм выпрацоўкі на перабленьне ільну, на вывучэньні балянсу рабочай сілы ў калгасах, правільнай яе расстаноўцы і разьмеркаваньні ў працэсе летніх палявых работ, на правільным скарыстаньні жаночае працы ў калгасах, асабліва ў раёнах масавага адыходу, на своячасовым пуску ільназаводаў.

**Ставім** пытальне аб перадачы гырабу абаднога кола ільнацерабілкі Люберецкім заводам на заводы Ленінграду і бярэм на сябе абавязацельства забясьпечыць пралетарскі кантроль над гэтай справай з тым, каб плян вырабу ільнацерабілак быў выканан цалкам і своячасова.

**Намячаем** баявую праграму барацьбы за высокія ўраджаі і зуладаньне тэхнікай ільнаводзтва шляхам фарсіраваньня і набліжэньня вопытнай справы непасрэдна да саўгасаў і калгасаў, арганізацыі рацыяналізатарскіх груп калгасьнікаў і калгасьніц, правядзеньня асеньніх выставак па ільну і г. д.

**Закліканем** усе органы друку падхапіць наш пачын, распрацаваць сваю канкрэтную баявую праграму дзеяньняў у барацьбе за сапыялістычнае ільнаводзтва.

**Выклікаем Наркамзем СССР, Ільнацэнтр, Галоўпляном стварыць усесаюзны фонд прэміяваньня ільнаводчых раёнаў,** якія пакажуць лепшыя результаты ў сяўбе і ўборцы ўраджаю ільну 1931 году ў відзе дадатковага завозу трактараў, ільнацерабілак, будаўніцтва ільназаводаў.

**Выклікаем** абласныя і раённыя вямельныя органы ільнаводчых раёнаў, кіруючыя органы калгасна-кааперацыйнай сыстэмы заняцца распрацоўкай усіх пытаньняў, зьвязаных з вырашэньнем праблем ільну, і забясьпечыць сапраўды апэратыўнае кіраўніцтва ў правядзеньні чарговых важнейшых задач па папярэньні ільняных плошчаў, поўнай і своячасовай уборцы ўраджаю ільну, паставіўшы на чале сваёй работы арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, аказаньне практычнай дапамогі сацыялістычнаму сэктару ільнаводчай гаспадаркі (ільнасаўгасам і калгасам) у выкананьні напружанай праграмы сяўбы ільну і яго ўборкі.

**Выклікаем** усіх спэцыялістаў сельскай гаспадаркі, эканамістаў, плянавых работнікаў уключыцца ў барацьбу за пён, ускласьці ўвесь свой вопыт і веды ў справу разьвіцьця сацыялістычнага ільнаводзтва.

**Выклікаем** сельска-гаспадарчыя вопытныя станцыі, навукова-дасьледчыя ўстановы і інстытуты сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі ільнаводчых абласьцей і раёнаў разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва па вывучэньні і распрацоўцы пытаньняў узьніцьця ўраджайнасьці і павышэньня тэхніні ільнаводзтва, вывучэньні праблемы ўшчыльненьня ільняных севазваротаў, адшуканьні магчымасьцей да далейшага пашырэньня ільняных плошчаў і стварэньні новых раёнаў інтэнсыўнага ільнаводзтва, укараненьні тэхнікі ільнаводзтва ў шырокія масы ільнаводаў-практыкаў і кіруючы актыў ільнаводчых раёнаў.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне пастаўленых задач магчыма ў тым выпадку, калі будзе забясьпечана з самага-ж пачатку цьвёрдае бальшавіцкае кіраўніцтва «ільняной пераклічкай», якая разгортваецца, калі партыйныя ячэйкі і партыйныя калектывы саўгасаў, калгасаў, сельсаветаў узначаляць разгортваньне паходу за лён, калі яны забясьпечаць уключэньне ў яго ўсіх арганізацый і с'ураўды масавы характар ільняной пераклічкі, калі будзе праводзіцца настойлівa барацьба з антыільняными настроямі, з апартуністычнай недаацэнкай значэньня разьвіцьця ільнаводзтва як глыбока гаспадарча-палітычнай праблемы, калі спробам клясавага ворага—кулацтва, якое ліквідуецца на аснове суцэльнай калектывізацыі, — сарваць плян разьвіцьця ільнаводзтва—будзе дан рашучаю адпор па ўсёй лініі, а боку ўсіх зьвяньняў партыйных, савецкіх, камсамольскіх, калгасных і іншых арганізацый ільнаводчых раёнаў.

Просім цэнтральны орган партыі «Правду» і «Социалистическое земледелие» узяць на сябе арбітраж аз ўсесаюзнай ільняной пераклічцы, шырока асьвятляць вопыт барацьбы за сацыялістычнае ільнаводзтва паасобных абласьцей і раёнаў, правяраць выкананьне абавязацельстваў па пераклічцы, забясьпечыўшы больш глыбокае і сыстэматычнае адлюстраваньне на сваіх старонках пытаньняў разьвіцьця ільнаводзтва, вынікаючых з пастаўленай партыяй задачы вырашэньня праблемы разьвіцьця тэхнічных культур

**Дэлегацыя абласнога друку Заходняй вобласьці:**

Прадстаўнікі абласных газэт «Рабочий путь», «Соц. деревня», «Большевистский молодняк» і абласной «Радиогазеты» Лібэрман і Нассноў.

Прадстаўнік аблаву і нам старшыня аблільнасаюзу — Гладкоў. Дырэктар Заходняй запальнай вопытнай станцыі па ільне — Нікіцін. Старшыня праўленьня калгасу «Вперед» к социализму», Руднянскага раёну — Варэцкаў. Старшыня калгасу «Ответ интервентам». Вяземскага раёну — Пятроў.

Прадстаўнікі абласнога друку і арганізацый Ленінградзкай вобласьці:

«Ленинградская правда»—Лэвіт. «Крестьянская правда» — Пытчін. «Смена» —Бачкароў. Аблаву — ЮСТ. Аблкалгасаюз — Ераменка, Аблільнасаюз—Завальнёў. Часопісь «Крестьянская деревня» — Стэрпін.

### Адкрыўся пашыраны пленум праўленьня БелАПП'у

12-га мая ў Доме Пісьменьніка пачаў сваю работу другі пленум праўленьня БелАПП'у, з удзелам рабочых-ударнікаў, прадстаўнікоў раённых філій і БелЛАЧАФ'у.

Пленум адкрыў адказны сакратар праўленьня БелАПП'у Я. 

## Новая пастаноўка БДТ-2

# „КАЧАГАРЫ“

Успомнім мінулы рэпэртуар БДТ-2. Ці быў ён нашым? Ці адлюстроўваў ён наша будаўніцтва? Ці служыў ён клясавым інтарэсам пралетарыяту? Мінулае тэатру зьяўляецца яго-ж абвінаваўчым актам.

Тэатр натхняла ня гэроіка будня сацыялістычнай будоўлі. Ня клясавая барацьба пралетарыяту, не барацьба суровая і ўпартая за сацыялізм была крыніцай яго творчасьці. Ідэі рабочае клясы і яе партыі ў будаўніцтве нацыянальнай культуры ня былі ідэямі тэатру.

Палітычны багаж БДТ-2 складалі прапаганда контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму («АПРАМЕТНАЯ», «КАЛЯ ТЭРАСЬ»), або захапленьне голай эстэтыкай, лёзунгам рэакцыі «мастацтва для мастацтва» («ЦАР МАКСІМІЛЬЯН», «ЭРОС І ПСІХЭЯ»).

Пастаноўка «Апраметнай» — п'есы, наскрозь прасякнутай нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіяй, ярка агаліла сапраўднае крэда тэатру. У ёй БДТ-2 паказаў свае ідэалы і імкненьні, паказаў свой твар. Ідэалы, браўшыя курс на буржуазны фашысцкі Захад, імкненьні, накіраваныя да прапаганды контр-рэвалюцыйнай легэнды аб «самабытнасьці», твар зброяносца нацыянал-дэмакратызму. Так, гэта п'еса і яе выканаўца сапраўды былі зброяй у руках нацыянал-фашысцкіх апалёгетаў кулацтва.

Тыя-ж знаёмыя матывы прагучэлі са сцэны тэатру і ў п'есе «Каля тэрасы». І тут БДТ-2 выступіў у ролі мастацкага «агітпрофу» нацыянал-дэмакратаў...

«РАЗЛОМ» і «РЭЙКІ ГУДУЦЬ» — першыя і значныя крокі тэатру да **рашучай перабудовы сваёй работы, да карэннай помкі сваіх старых мастацка-палітычных пасьцыў.**

Новая пастаноўка БДТ-2 «КАЧАГАРЫ» паказвае, што гэты працэс разгортваецца з нарастаючай сілай.

П'еса І. Гурскага «Качагары» — **сур'ёзная падзея.** Яна выклікала хвалю гарачых спрэчак і самых розпастайных думак. Ужо сам на сабе гэты факт, гэта актыўнасьць глядача, гэтыя спрэчкі зьяўляюцца тэрмомэтрам таго інтарэсу, які ўзьнік вакол «Качагараў».

«Качагары» і Гурскага — першая **спроба адлюстраваць у мастацкай форме нашу барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, выкрыць яго сацыяльную сутнасьць, сарваць маску з яго сапраўдных мэт і задач.** У гэтым — галоўнае значэньне п'есы, галоўная заслуга ае аўтара. «Качагары» — клясавая п'еса. І. Гурскі імкнецца мастацка адлюстраваць, як нацыянал-дэмакраты — гэтыя лёкаі Пуанкарэ і Пілсудзкіх—плядзілі новай антысавецкай байны. Аўтар хоча паказаць у мастацкай форме, што за ідэямі нацыянал-дэмакратызму хаваюцца шпіёнаж, шкодніцтва, прослая і верная служба контр-рэвалюцыі.

Гэта насычаецьць «Качагараў» клясавай рэвалюцыйнай тэматыкай робіць п'есу фактам буйнога значэньня. Яна паказвае шчырае імкненьне і аўтара і тэатру аллюстраваць у мастацтве наша сёньня, нашу барацьбу, выкрыць твар нашых клясавых ворагаў.

Дынаміка «Качагараў» — дынаміка калектыву. Калектыў запаўняе п'есу. Аўтар паказвае жыцьцё электрастанцыі, дае ля палаючых топак качагары-энтузіясты ўпарта б'юцца за прамфінплян, ня гледзячы на ўсе падрыўныя манэўры дырэктара-шкодніка і яго палючікаў. Кучка шпіёнаў, агентаў дэфэнзывы, з якімі цесна зьвязан і дырэктар электрастанцыі, махровы нацыянал-дэмакрат, арганізуе дывэрсыйныя акты.

Перны-ж удар рыхтуецца супроць электрастанцыі. На гэтым фоне разгортваецца ўся фабула «Качагараў».

Паасобныя тыпажы п'есы зроблены моцна і пераканаўча, напрыклад, яркая фігура старшыні РВК Шчукіна. Нямала ёсьць у супраўднасьці такіх Шчукіных, безнадзейных апартуністаў, да канца паражоных клясавай сьлепатою. Бязьмежна пераканаўня ў сабе штампоўшчыкі Шчукіны, самі таго ня ведаючы, аказвалі простую дапамогу шкоднікам. Колькі такіх апартуністычных сьляпцоў, калі шкоднікі рабілі сваю контр-рэвалюцыйную справу, у тэй ці іншай форме паўтаралі ганаровыя словы Шчукіна:

— На «вверенной мне территории» ніякай контр-рэвалюцыі, ніякіх ухіляў няма...

Аўтар выкрывае Шчукіных з мастацкай пераконанасьцю. У глядача ўзьнімаецца пагарда да Шчукіных, нянавісьць да іх клясавай сьлепаты.

Дасканала паказаны захапляючы момант, калі качагары з небясьпекай для жыцьця, каб не дапусьціць спыненьня работы на электрастанцыі, рамантуюць каласьнікі, напсаваныя шкоднікам. Моцна, бадзёра з уздымам зроблена і канцоўка п'есы.

Аднак, нельга апэньваць п'есу толькі па адным яе мэтаімкненьні. Адна тэма **ня ёсьць** яшчэ рашаючы крытэрый ў ацэнцы п'есы. Галоўнае ў тым, як аўтар на справе ажыцьцявіў асноўную мэту, асноўную задачу сваёй п'есы. Ацэнку «Качагараў» вырашае пытаньне — **ці здолеў аўтар у сваёй п'есе правільна і з пераканаўчай мастацкай сілай адлюстраваць барацьбу партыі з ідэалёгіяй і практыкай беларускай контр-рэвалюцыі — нацыянал-дэмакратаў.** Іншымі словамі, ці выканаў аўтар задачу, пастаўленую перад сабой у «Качагарах»?

Было-б грубай і шкоднай памылкай прайсьці міма тых глыбокіх і **палітычных і мастацкіх прарываў,** якія дапушчаны ў п'есе. На іх **нельга ня ўказаць** аўтару «Качагараў».

1. Гурскі імкнецца адлюстраваць у сваёй п'есе амаль **усе** пытаньні, **не ўхапіўшыся як сьлед за адно** аспўнае зьвяно. Стварэецца ўражаньне, што аўтар паставіў перад сабой цьвёрдую мэту ахапіць у «Качагарах» усе лёзунгі партыі. Такая празьмерная «шчодрасьць» яўна не пад сілу аўтару і толькі папкодзіла п'есе. Яна заблытала Гурскага і штурхнула яго шукаць выхаду ў трафарэтнай і казённай мітынгоўшчыне, зьвяшчуй і аслабіўшай мастацкую сілу п'есы.

Жадаючы ахапіць усё, аўтар незалежна ад яго шчырых імкненьняў, аспўнае паказаў у скажоным выглядзе, пасьлізнуўшыся і на мастацкім, і на палітычным зьмесьце «Качагараў».

Паасобныя і бадай самыя галоўныя моманты п'есы **няправільна** арыентуюць глядача. Барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам аўтар улажыў у рамкі аднабаковай і спрошчанай схэмы. Паказ гэтае барацьбы ў «Качагарах» **не атрымуе** правільнага палітычнага зьместу. Адсюль бярэ свой пачатак аспўная памылка аўтара, якая балюча б'е па сацыяльнай значнасьці п'есы.

Барацьба партыі з ідэалёгіяй і практыкай нацыянал-дэмакратызму ў п'есе **не знайшла** правільнага адлюстраваньня. Аўтар няверна арыентуе масавага глядача, лёгкадумна праходзячы міма аспўных і рашаючых вагароў гэтае барацьбы. Роля партыйнай арганізацыі і яе кіраўніцтва паказана аўтарам у крывым люстры.

На самой справе, як схематычна і аднабока скарыстаў аўтар «Качагараў» гістарычныя факты. Як аднабока адлюстроўваюцца яны ў яго п'есе.

У аўтара з нацыянал-дэмакратызмам змагаецца, правільней, толькі прабуе весьці барацьбу, адзін старшыня заўкому электрастанцыі камуніст Асмалоўскі. Ён адзін адчувае, што ў раёне штосьці нядобра, што тут дзейнічае нейкая контр-рэвалюцыйная арганізацыя. Яго падтрымліваюць адны качагары. Самі яны ня ведаюць, у чым справа, не ўяўляюць сабе, што адбываецца вакол. Але клясавая пралетарская чуласьць дыктуе качагарам, што іх таварыш мае рацыю, што яго трэба падтрымаць, аказаць яму таварыскую дапамогу.

У раёне-ж арудуюць шпіёны і шкоднікі ў цесным саюзе з нацыянал-дэмакратамі. Яны дзейнічаюць па загадзе дэфэнзывы, выконваючы дырэктывы палкоўніка Чэнстахоўскага. Перад інтэрвэнцыяй схіляюць свае калоні і нацыянал-апартуніст дырэктар электрастанцыі Івакоўскі, які стаў простым шкоднікам, і польская шпіёнка Катаржыцкая. У імя інтэрвэнцыі ўслаўляе творчасьць нацыянал-дэмакратычных пісьменьнікаў «марксыцка-крыўскі» крытык Дзічка.

У асобным эпізодзе з жыцьця адпаго раёну аўтар імкнецца да канца выкрыць усю сапраўдную сутнасьць нацыянал-дэмакратызму. На сцэне ўсплываюць натаемныя спружыны, якія рушылі нацыянал-дэмакратамі. Інтэрвэнцыя ў асобе Пуанкарэ і Пілсудзкага інструктуе сваіх беларускіх нацыянал-дэмакратычных лёкаяў.

Відавочна, што аўтар павінен быў мастацкі **адлюстраваць і барацьбу партыі з нацыянал-дэмакратызмам,** паказаць, як партыя мабілізуе масы на барацьбу супроць пагрозы інтэрвэнцыі, як яна выкрыла і разграміла нацыянал-дэмакратаў і іх нацыянал-апартуністычных агентаў. Гэтага аўтар «Качагараў» **НЕ ЗРАБІЎ.** Паўтараем, у п'есе ў ролі барацьбіта паказан толькі адзін Асмалоўскі.

Партыйная арганізацыя стаіць у баку. Яна нічога не заўважае. Кіраўніцтва арганізацыі, у прыватнасьці сакратар партыйнага камітэту, глядаць на ўсё скрозь ружовыя апартуністычныя акуляры. Сакратар РК партыі **Чысьцякоў,** гэта нейкі аўтамат, запёрты ў габінэце, кволы, бязвольны інтэлігэнт. Ён не давярае Асмалоўскаму, не падзяляе яго здагадак, ён цалкам стаіць за апартуніста Шчукіна і нацыянал-шкодніка Івановскага.

Шкоднікі і шпіёны пачынаюць цкаваць Асмалоўскага. Дырэктар электрастанцыі і Шчукін, які сьлепа выконвае волю сваёй жонкі-шпіёнкі, не шкадуюць сіл, каб прыбраць з дарогі камуніста Асмалоўскага. Яго пакідае нават і блізкі таварыш жанарганізатар і член райкому Сулькіна.

Асмалоўскі адзін, калі ня лічыць падтрыманьня з боку качагараў, перад тварам згуртаванай кучкі шкоднікаў, шпіёнаў, нацыянал-дэмакратаў. Ён кідаецца за дапамогаю ў газэту. Асмалоўскі сыгналізуе ў **«Зьвязду»,** што ў раёне ня ўсё добра, што тут напэўна дзейнічае контр-рэвалюцыйная арганізацыя, што раённыя кіраўнікі скажаюць лінію партыі. Дарэмная надзея. І «Зьвязда» адказвае Асмалоўскаму халодным маўчаньнем. У райкоме ён даведаўся, што яго карэспандэнцыя прыслана сюды-ж... на расьсьледваньне. Страціўшы ўсякую надзею, Асмалоўскі з роспачну махае рукой: І «Зьвязда» ня верыць...

Адразу-ж партыйны камітэт, уведзены ў зман шкоднікам Івановскім, выкідвае Асмалоўскага з партыі.

У глядача стварэецца ўпэўненасьць, што ні партыйная арганізацыя, ні яе кіраўніцтва зусім **не змагаліся** з нацыянал-дэмакратызмам. У п'есе парткіраўніцтва цалкам заражана апартунізмам і страціла ўсякую клясавую пільнасьць. Гэтыя-ж якасьці аўтар пераносіць і на партыйны друк у асобе «Зьвязды», якая не адказвае паводле п'есы на калектыўны сыгнал качагараў электрастанцыі. Выходзіць, што ніякай барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам партыйная арганізацыя не вяла, і нацыянал-дэмакраты выкрываюцца толькі тады, калі на сцэне зьяўляецца ДПУ.

Ці так было ў сапраўднасьці? Ці ня ёсьць гэта аб'ектыўны паклёп на гістарычныя факты. **Іменна толькі на аснове бальшэвіцкай і пасьлядоўнай барацьбы КП(б)Б супроць нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-апартунізму была выкрыта і ліквідавана органамі ДПУ контр-рэвалюцыйная, нацыянал-дэмакратычная група. Іменна партыйная прэса («Зьвязда») пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту дала адкрыты бой нацыянал-дэмакратам.** Дзеля чаго скажаць факты? Дзеля чаго сказваць ролю партыйнай арганізацыі ў такім мізэрным і нікчэмным аднабокім выглядзе. Масавы глядач можа ўвасобіць ролю партыйнай арганізацыі і яе кіраўніцтва, паказаныя ў п'есе, з роляй КП(б)Б у барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам.

Такая фабула п'есы, такі аднабокі падбор фактаў, такі падход аўтара і прывялі яго да глыбокага палітычнага прарыву. Гэты прарыў яшчэ больш пагыбляецца тым, што аўтар мастацкі **не апраўдаў** памылку партыйнай арганізацыі і яе камітэту. **Няжыцьцёва, непераканаўча,** неяк камічна паказан у п'есе момант, дзе сакратар райкому Чысьцякоў прызнаецца ў сваіх памылках, дапушчаных ім у справе Асмалоўскага.

Да глядача не даходзіць казённая сцэна, калі Чысьцякоў, прыпоўны на сход парт'ячэйкі качагараў, займаецца самабічаваньнем. Аўтар не паказвае, як партыйны-качагары пераканалі Чысьцякова. Усё адбываецца мэханічна і хутка. Чысьцякоў гаворыць пару шаблённых, агульных фраз аб агульных задачах і раптам нечакана заяўляе, што ён у справе Асмалоўскага, яшчэ ўчора ім-жа выкінутага з партыі, памыляўся. Чаму? Што прымусіла Чысьцякова прызнаць свае памылкі? Невядома. П'еса гэтага не паказвае. Глядач павінен здагадацца сам. У выніку няма ніякага мастацкага эфэкту, ніякай, нават самай нязначнай крупіцы мастацкага перакананьня.

Таксама непераканаўча, павярхоўна паказвае аўтар і твар нацыянал-дэмакратычных пісьменьнікаў. У п'есе яны маюць выгляд круглых ідыётаў, нейкай мізэрнай, сюсюкаючай багемы, нікчэмных інтэлігентаў. Такі прыём не выкрывае ворагаў. Ён выклікае да іх, у лепшым выпадку, толькі пагардлівае пачуцьцё, аналёгічнае з тым, якое так мастацкі адлюстравана ў байцы Крылова «Слон и моська».

Ня так праходзіла барацьба з контр-рэвалюцыйнымі нацыянал-дэмакратычнымі плынямі ў нашай літаратуры. Калі-б на самой справе вораг быў такім, якім ён паказан у «Качагарах», ня варта было-б гаварыць аб упартай і сур'ёзнай барацьбе. Дзеля чаго? Варта было-б толькі крыкнуць на іх, як гэта зрабілі качагары ў п'есе І. Гурскага, і літаратурныя эпігоны кулацтва разьбегліся-б па кутках, як перапалоханыя пацукі. Зброя сатыры, яе магутнае і несакрушальнае джала ў руках аўтара «Качагараў» ператварылася ў безданапаможны дзіцячы пугач.

Аўтар **ня здолеў** з належнай мастацкай сілай выкрыць кулацкі твар нацыянал-дэмакратаў з «Полыня» і «Узвышша», што паводле п'есы было адной з яго цэнтральных задач. І ня толькі мастацкі, **але і палітычна.**

Укладзеная аўтарам у вусны буржуазнага нацыянал-дэмакратычнага крытыка Дзічкі безапэляцыйная заява, што быццам у беларускай літаратуры былі толькі тры літаратурныя групоўкі, паміж якімі на сутнасьці справы не існавала ніякай розьніцы,—**здольна толькі заблытаць глядача.** Яна замазвае тую шалёную барацьбу, якую вялі нашдэмы з «Узвышша» і «Полыня» супроць беларускай пралетарскай літаратуры — БелАПП'у. Выходзіць, што і БелАПП быў адным з літаратурных філіялаў нацыянал-дэмакратызму.

Беларуская пралетарская літаратура ў п'есе зусім слаба процінастаўлена нацыянал-дэмакратычным пісьменьнікам. Яе ня можа ўвасобіць адзін пралетарскі пісьменьнік, паказаны ў «Качагарах». Дый як ён паказан? Прадэклямаваўшы адзін слабенькі вершык, ён ідзе да качагараў, пакідаючы поле бою за нацыянал-дэмакратычнымі пісьменьнікамі.

Не дасягае мэты заява гэтага пісьменьніка аб тым, што яго шлях не ляжыць разам з паэтамі ад нацыянал-дэмакратызму. Аб'ектыўна выходзіць, што пралетарская літаратура спакойна склала свае рукі і адышла з літаратурнага фронту, даўшы магчымасьць нацыянал-дэмакратычным пісьменьнікам прапагандаваць свае погляды, калі не сярод качагараў электрастанцыі, дык у іншых мясцох. Ня так было ў сапраўднасьці. **Ня так павінен быў зрабіць аўтар.** Пралетарскія пісьменьнікі ня толькі займаліся дэклямацыяй, але і змагаліся над кіраўніцтвам партыі, упарта і жорстка змагаліся з паэтычнымі глашатаямі інтэрвэнцыі, з літаратурнымі эпігонамі кулацтва.

Такія асноўныя памылкі аўтара, памылкі, якія ня маюць ніякага апраўданьня, памылкі, якія павінны быць неадкладна выпраўлены. Рад іншых, больш ці менш сур'ёзных палітычных прарываў мы абыходзім. Хаця зусім не зразумела, напрыклад, чаму аўтар ліквідаваў беларускую «лявоніху» нацыянал-дэмакратычнай, а «польку» — пралетарскай. Нельга апраўдаць таксама і імкненьня аўтара паказаць нацыянал-дэмакратызм толькі ў відзе сыстэмы шпіёнажу, шкодніцтва і дывэрсій, абыходзячы яго сацыяльныя карэньні, не паказваючы, у якіх, часамі, хітра завуаляваных формах праяўляецца нацыянал-дэмакратычная ідэалёгія.

Характарыстыка п'есы была-б няпоўнай, калі не закрануць яе мастацкага боку. І тут у аўтара «Качагараў» далёка ня ўсё добра. Тут з **найбольшай сілай выяўляюцца ўсе сур'ёзныя недахопы яго п'есы.** Акторскі калектыў відаць паклаў ня мала энэргіі і сіл, каб даць высокаякаснае, мастацкае афармленьне п'есы. Аднак, спэцыфічныя асаблівасьці п'есы зьявіліся сур'ёзнай перашкодай.

Дыктатура мітынгоўшчыны, нязьлічоныя перапевы трафарэтных лёзунгаў, нястрыманая дэклямацыя шаблённых і агульных фраз — вось што губіць мастацкую каштоўнасьць п'есы. У аўтара качагары пераважна стаяць не ля сваіх топак, а займаюцца выкрыкваньнем мітынговых лёзунгаў. Яны толькі і ведаюць, што клянуцца выкінуць пяцігодку за чатыры гады і абараняць СССР.

П'еса не адлюстроўвае жыцьця выгворчасьці. Аўтар ня ведае, чым дыхае рабочы, аўтар шаблёнізуе яго работу, яго мову, яго думкі і штодзённую барацьбу.

Ля варштатаў і машын, ля палаючых топак, у агні сацыялістычнага спаборніцтва, у барацьбе за тэмпы, за якасьць, за рацыяналізацыю, за тэхніку кусцца нерамога пяцігодкі. Словамі сацыялізму не набудуеш. Ударнікі-качагары разам з усёй рабочай клясай, пад кіраўніцтвам партыі, будуюць яго ў штодзённай напружанай барацьбе за прамфінплян, адкідаючы прэч шкодніцкую, апартуністкую, прагульшчыкаў. А аўтар імкнецца будуе сацыялізм пры дапамозе адных толькі слоў. Ён ператварае качагараў у нейкіх рэвалюцыйных манэкэнаў, якія бяз усякай меры паўтараюць адны і тыя-ж словы.

Гэта мастацкае ўбоства аўтара з усёй сілай выяўляецца ў эпізодзе з падпалам электрастанцыі.

Шкоднікі і шпіёны падпалілі электрастанцыю. Увесь будынак у агні. Станцыі пагражае пагібель. Цэхі ахоплены полымем. Паніка. І раптам... Качагар кідаецца ў палаючую станцыю і, акружаны агнём і клубамі дыму, крычыць...

— У разгорнутае наступленьне сацыялізму на ўсім фронце.

Якая насьмешка! Якое ўбоства мастацкага прыёму! Дзе гэта бачылі, каб у момант пажару, у хвіліну небясьпекі рабочыя займаліся-б бескарысным мітынгаваньнем. Як гэта далёка ад жыцьця! Як аўтар утырыце наказ гэраізму рабочае клясы, яе непахісная волі да перамогі!

Прыцягнута за валасы і сцэна з забойствам камсамольца ў калгасе. Гэты мімалётны эпізод, уклены ў п'есу, адразу-ж выпадае, і глядач аб ім забывае. Зроблена яна таксама мэханічна і шаблёна. Аўтар паказвае перад глядачом не камсамольца-бойца за калгасы, а нейкага няжыцьцёвага энтузіяста, які маршыруе па дарозе і бязупынна паўтарае адны і тыя-ж словы:

— Наш сельсавет суцэльна калектывізаваны...

***

«Качагары» па сваім мэтаімкненьні, па сваёй тэматыцы—наша п'еса

**Але яна патрабуе карэннай гэнэральнай рэканструкцыі.**

**С. БУДЗІНСКІ, А. МІТЛІН, ЮР. ТАКАРЧУК, АЛ. КАРАЧУН, В. САМУЦІН, Я. ІВАШЫН, МІХ. ЛЯВОНЕНКА.**

## ЗАМЕТКІ ГЛЯДАЧОЎ

У гэтай заметцы мы не гаворым ні аб мастацкіх дасягненьнях, ні аб мастацкіх слабасьцях п'есы «Качагары». Нас цікавяць толькі выключна тыя моманты і эпізоды ў п'есе, якія, па нашай думцы, палітычна шкодныя і якія, незалежна ад добрых намераў аўтара і акторскага калектыву, могуць быць направільна ўспрыняты масавым глядачом. Да такога роду момантаў перш за ўсё адносіцца няправільны паказ ролі партыі. Стварэецца ўражаньне, быццам ва ўсёй раённай партыйнай арганізацыі адзіная сапраўды здаровая група — гэта рабочыя вытворчасьці — качагары, якія нутром успрымаюць бальшавіцкую праўду. Вер хавінка-ж аказалася заблытанай у даволі няўмелых сецях, расстаўленых шкоднікамі, шпіёнамі, клясавымі ворагамі. Аўтар п'есы ня хоча сказаць, быццам у мясцовай партыйнай арганізацыі была няправільная лінія, наадварот, ён проста гаворыць (вуснамі сакратара парткамітэту, які дзейнічаў і граў, да рэчы, як манэкэн) аб **памылцы.** Але памылка партыйнага камітэту, які наогул бараніў правільную лінію, павінна быць ня толькі мастацкі, але і палітычна **апраўдана,** г. зн. трэба паказаць глядачу, якім чынам і ў якой абстаноўцы магчымы такія памылкі, і трэба паказаць такую абстаноўку, у якой сапраўды добрыя партыйцы могуць сапраўды дапускаць тыя ці іншыя памылкі. Але ў глядача ня толькі не стварэецца тлумачэньне памылак, але, наадварот, у яго зусім натуральна складаецца ўражаньне — дый ня можа на скласьціся,—што партыйная арганізацыя не вядзе ніякай барацьбы з нацдэмаўшчынай (з контр-рэвалюцыйнай ідэалёгіяй і яе праўленьнямі) і нават садзейнічае ўкараненню і ўзмацненьню нацдэмаўшчыны наперакор супраціўленьню рабочых вытворчасьці — партыйцаў. Гэта ўражаньне тым больш пагыбляецца, што на працягу ўсёй пьесы ўласьне нідзе не паказана барацьба партыйнай арганізацыі з нац-дэмаўскай контр-рэвалюцыйнай ідэалёгіяй. П'еса заканчваецца ліквідацыяй нацдэмаўскай арганізацыі органамі ДПУ, але барацьбы з нацдэмаўскай ідэалёгіяй глядач так-такі і ня бачыць. Такое ўражаньне, бязумоўна, зьяўляецца шкодным і павінна быць зьнішчана. Партыя ня толькі вядзе, але і вяла барацьбу з нацдэмаўскай ідэалёгіяй, тактыкай, палітыкай, а усімі іх праяўленьнямі ў розных галінах культурнага, гаспадарчага і палітычнага жыцьця. На аснове гэтай барацьбы органамі ДПУ была дасканала раскрыта двойнасьць нацдэмаўскай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі. Вось гэта і трэба паказаць глядачу, а не абмяжоўвацца паказам — зусім неабходным —барацьбы органаў ДПУ, якая складае толькі частку агульна-партыйнай барацьбы з варожымі плынямі і клясамі.

Другое, што кідаецца ў вочы, гэта, бязумоўна, няўдалы паказ беларускіх пісьменьнікаў. Няшчасьце п'есы (і аўтара і акторскага калектыву) заключаецца ў тым, што яны паказалі ня столькі тых ці іншых беларускіх літаратараў, творчасьць якіх была прасякнута нацдэмаўскай ідэалёгіяй, колькі беларускую літаратуру, і зноў такі стварэецца ўражаньне такое, што ўся яна цалкам нацдэмаўская.

У п'есе абсалютна не паказана тое новае, мастацкае і палітычна каштоўнае, што прынесла маладая беларуская савецкая літаратура. Нідзе глядач ня бачыць, не адчувае і ня чуе аб якойсьці іншай літаратурнай і мастацкай культуры, якая-б не зьяўлялася варожай пралетарыяту і савецкай уладзе. Зноў такі ў глядача можа стварыцца агульнае і няправільнае абагульваньне, якое іншага незадчуваючага глядача можа прывесьці да таго выводу, быццам уся культурная дзейнасьць у Беларусі была наскрозь прасякнута нацдэмаўствам. П'еса правільна высьмейвае зусім штучную і недарэчную фэтышызацыю самабытнасьці і старабытнасьці з боку пісьменьнікаў, наскрозь прасякнутых гнілой факстратурай культурай буржаазіі, якая разлагаецца. Але ў ёй не захавана мера. Вядома, вельмі цікава і правільна было паказаць, як матывы «лявонікі» злучаюцца ў гэтых так званых прадстаўнікоў нацыянальнай культуры з «факстротам». Але, выпадкова ці невыпадкова, калі калгасьнікі сустракаюцца разам з работнікамі, што надладзілі трактар, дык гармонік грае не народную «лявоніху», а ня больш чым «лявоніха» — пралетарскую «польку». Можа скласьціся ўражаньне, быццам «лявоніха» абавязкова злучаецца з «факстротам», а з трактарам можа злучацца што хочаце, напрыклад, «полька», але ўжо не «лявоніха». Вядома, гэты штрышок ня мае істотнага значэньня, але-ж задача заключаецца якраз у тым, каб паказаць, што ніякай асобнай, ізаляванай, існуючай незалежна ад уплыву сучаснай культуры, самабытнай, старадаўняй «лявонікі» ня існуе. Матывы «лявонікі» злучаюцца або з «факстротам», або з трактарам, «інтэрнацыяналам», з саўгасам. Здолець паказаць, што за нацыянальнай формай таяцца розныя па зьмесьце культуры: і буржуазная і сацыялістычная, пралетарская культура— у гэтым, па нашай думцы, заключаецца задача п'есы. Гэта не паказана ў п'есе ў выстарчальнай меры, а часамі проста адмаўляецца паасобнымі эпізодамі.

1, нарэшце, трэцяя і апошняя наша заўвага. Самы лёгкі сродак барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал-дэмакратамі — гэта паказаць іх або ў сьмешным адзеньні старых, нікчэмных, дурных дзівакоў, або ў ролі простых і платных агентаў Пуанкарэ. Нам здаецца, што задача тут крыху спрашчаецца. Ўнутры партыі пранікненьне нацдэмаўскай ідэалёгіі аб'ектыўна, вядома, азначала ня што іншае, як у канчатковым выніку служэньне варожым клясавым сілам, г. зн. у тым ліку і Пуанкарэ. Але, вядома, барацьба з нацыянал-дэмакратызмам была-б вельмі простай, калі-б яна прымала заўсёды такую недарэчную і заўсёды проста інтэрвэнцыяністкую форму. Бо задача заключаецца шчэ і ў тым, каб паказаць **тонка** пранікаючы нацыянал-дэмакратызм, які спрытна прыкрываецца марксыцкай фразэалёгіяй, скарыстоўвае вельмі ўмела і спрытна ня толькі памылкі асобных прадстаўнікоў партыі (або асобных партыйных арганізацый), але і тонка скарыстоўвае неабходную работу па ўзьнікці і разьвіцьці нацыянальнай формы культуры. Гэтага ў п'есе няма і гэта зноў такі аслабляе яе палітычную значнасьць.

Не сумняваючыся ў тым, што гэта п'еса зьяўляецца, бязумоўна, крокам наперад як па сваёй тэхніцы, так і мэтавай устаноўцы ў разьвіцьці беларускага тэатру, нам здаецца, аднак, што памылкі і недахопы гэтай п'есы павінны быць выказаны, абмеркаваны, усьядомлены, выпраўлены найбольш быстра з тым, каб гэта разьвіцьцё здолела яшчэ большымі крокамі рушыцца далей.

**М. ПОТАШ.**
**В. СЭРБЭНТА.**
**М. ЮГАЎ.**

# ХРОНІКА

## Прыгавар па справе антысэмітаў з торфзаводу „Ізапліт № 2“

**АСІПОВІЧЫ.** (Наш кар.). У свой час «Зьвязда» паведамляла аб выпадку антысэмітаў на торфазаводзе «Ізапліт № 2» і аб абураючых зьдзеках з іх бому над рабочым-яўрэем тав. НЯВЕЛЬСКІМ. Нядаўна справа гэта разглядалася выязной сэсіяй Вярхоўнага Суда.

Судовае сьледзтва поўнасьцю пацьвердзіла даныя абвінавачаньня

Суд пастанавіў: СТАРАВОЙТАВА — саспаць у папраўча-працоўных лягары ў далёкіх мясцовасьцях СССР на 6 год, Сьцяпанцава—на 8 год, Сасіноўскага—на 5 год, з паражэньнем у правох на 5 год кожнага.

## Дэкада Камакадэміі ў БССР

З 15-га па 25-га мая ў БССР будзе праведзена дэкада Камуністычнай Акадэміі.

Дэкада нападжваецца Беларускай Акадэміяй Навук і Інстытутам літаратуры, мастацтва і мовы Камуністычнай Акадэміі, пры ўдзеле ВОАПП і БелАПП. Інстытут выпучыў дэлегацыю для паездкі ў БССР і для пастаноўкі дакладаў у беларускіх навукова-навучальных установах. У склад дэлегацыі ўваходзяць т. т. Дзінамаў, Луначарскі, Нусінаў, Каваленка і іншыя,—усяго 12 чал. Старшынёй дэлегацыі і прадстаўніком Прэзыдыуму Камуністычнай Акадэміі зацьверджаны тав. Дзінамаў.

Асноўны лёзунг дэкады: «ЗА МАРКСЫЗМ-ЛЕНІНІЗМ У ЛІТАРАТУРНАЙ НАВУЦЫ». Асноўная задача—прапрацоўка ленінскай спадчыны, пастаноўка, на аснове ленінізму, галоўных праблем літаратурнай навукі. Ня меншае значэньне мае пытаньне аб разьвіцьці культурнага будаўніцтва БССР, аб навукультурнай культуры. Будзе прачытацыянальная культура. Будзе прачытаны рад дакладаў: на тэмы «Ленін, Сталін і асноўныя пытаньні навукультуры», «Сучасная літаратура БССР» і г. д. Працоўным БССР будзе перадан вопыт работы Інстытуту літаратуры, мастацтва і мовы Камакадэміі над творчасьцю вялікага пралетарскага пісьменьніка, барацьбіта за СССР—Максіма Горкага; вопыт крытыкі літаратурных поглядаў Пляханава ў сьвятле ленінізму і г. д. Актуальнае значэньне мае таксама пытаньне аб фашысцкай і сацыял-фашысцкай зарубежнай літаратуры, якому будзе прысьвечаны рад дакладаў.

## ПРЫЕЗД ТЭАТРУ „ЮНАГА ГЛЯДАЧА“

З 15-га па 24-га мая ў Менску адбудуцца гастролі маскоўскага тэатру «Юнага глядача», які ставіць сваёй асноўнай мэтай камуністычнае і адпаведнае маскоўскае выхаваньне падрастаючага пакаленьня. Будзе арганізаваны рад ранішнікаў для дзяцей. Апрача пастановак, тэатр правядзе канфэрэнцыі і гутаркі з настаўнікамі і важатымі па пытаньні самадзейнай работы ў школе. Гутаркі будуць праведзены пад кіраўніцтвам пісьменьніка С. Аўсяндэра.

У рэпэртуары маскоўскага тэатру юнага глядача наступныя пастаноўкі: юнага глядача наступныя пастаноўкі: «Гураганны агонь» (гульня — спэк. «Гураганны агонь» (гульня — спэк-такль, прысьвечаны юным прыхільнікам, - прысьвечаны юным прыхільнікам Асоавіяхіму). «Мядзьведжая паслугам Асоавіяхіму). «Мядзьведжая паслуга» (МОПР у Італіі, барацьба піянэраў з фашыстамі), «Шлях далёкі» (здарэньні на КУ чыг.), «Другагодзікі» (вадзні на КУ чыг.), «Другагодзікі» (вадзні на КУ чыг.), «Паветраны цырк» і г. д. Пасьля Менску тэатр наведвае Воршу, Магілёў, Жлобін і Гомель.

## Тав. Міхайлаў аслабанён ад абавязкаў нам. Наркам'юсту

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанавіў аслабаніць тав. Н. Я. Міхайлава ад абавязкаў нам. народнага камісара юстыцыі, у сувязі з перахадам яго на іншую работу.

## Камісіі садзейнасьці пры калгассыстэме

**Для ўзмацненьня мабілізацыі сродкаў па аграмадженым сэктары сельскага гаспадаркі, для шырокага прыцягненьня зьберажэньняў калгасьнікаў на фінансаваньне сацыялістычнага будаўніцтва, пры калгасным сыстэме БССР арганізуюцца сталыя камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе.**

**Для аб'яднаньня і агульнага кіраўніцтва работай камісій усіх зьвяновыў калгасным сыстэмы, пры Белкалгасцэнтры арганізуецца цэнтральная камісія садзейнасьці. Адпаведныя камісіі ствараюцца пры райкалгассаюзах.**

## На Ленінградзкай фабрыцы Белдзяржкіно

— Прыступіла да работы здымачная брыгада № 9, якая рыхтуе фільм «Дырэктар каля варштату» на тэму аб новых сацыялістычных мэтадах працы і новых адносінах рабочых да работы. Сцэнары В. Брадзянскага. Рэжысэр М. Авэрбах.

— Ударная здымачная брыгада № 8 выехала ў Менск для здымкаў фільмы «Як гэта будзе» па сцэнарыі Вярхоўскага. Карціну ставіць рэжысэр Ю. Тарыч.

— Прыбыла з паездкі па БССР ударная брыгада № 6, якая здымала агітпрофільму «Наш штурм». Тэма карціны—падрыхтоўка нацыянальных пралетарскіх кадраў. У працэсе работы экспедыцыя засьняла рад ВНУ БССР.

# Ленінградзкая вобласьць і Украіна чакаюць насеннай бульбы

## Загатоўчыя сыстэмы БССР абавязаны выканаць дырэктыву аб адгрузцы насеннай бульбы не пазьней 15 мая

## 15 мая—канчатковы тэрмін

Чацьверка ЦК КП(б)Б і СНК БССР адзначыла поўны зрыў бульбазагатовак у красавіку, асабліва па адгрузцы насеннай бульбы па ўдарных заданьнях (Масква, Ленінградзкая вобласьць, Украіна).

Першая пяцідзёнка мая таксама не дала ніякага зруху.

Чацьверка пастанавіла ўстанавіць КАНЧАТКОВЫ ТЭРМІН АДГРУЗКІ НА СЕННАЙ БУЛЬБЫ 15-ГА МАЯ і катэгарычна пацьвердзіць ранейшую пастанову чацьверкі аб забароне якога-б там ні было скарыстаньня загатоўленай бульбы на мясцовыя патрэбы да выкананьня ўдарных заданьняў па адгрузцы. Адказнасьць за выкананьне гэтай пастановы ускладзена пэрсанальна на сакратароў райкомаў і старшынь рай